Год II. Панядзелак, 9 студня 1922 г. (29 дзекабра 1921 г.) № 2

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9).
Адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 п. м., на 6 мес. 750 п. мар. За граніцай у два разы даражэй.
Цана абвестак: 75 польск. мар. за радок самага дробнага шрыфту.

Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі на адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам пісаўшага і адрэсам яго (для ведама Рэдакцыі). Няпрынятыя у друк рукапісы назад не аддаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

№ каштуець 30 польск. мар.
Газэта выходзіць раз у тыдзень.

Абвестка.

Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Прасьветы з 10 студня (январа) г. г. адчыняе ў г. Дзьвінску аднагадовыя вячэрныя вучыцельскія курсы для падгатоўкі вучыцялёў і вучыцеляк у беларускія аснаўныя школы.

На курсы прыймаюцца асобы абодвых полаў не маладзей 17 гадоў.

Асобы, палучыўшыя закончаную сярэднюю адукацыю і маючыя атэстат ня ніжэй 6 клясаў сярэдняе школы або скончыўшыя вучыцельскую сэмінарыю ці пэдагогічныя курсы прыймаюцца без экзамену і ў першаю чаргу. Асобы з адукацыяй ніжэй 6-цёх клясаў трымаюць прыймовыя экзамены.

Навучаньне на курсах бясплатнае; для курсантаў з правінцыі мае быць устроен пансіон.

Просьбы з дакумэнтамі аб адукацыі і мэтрыкамі аб часе нарадзін трэба пасылаць па адрэсу: Беларускае культурна-прасьветнае Таварыства „Бацькаўшчына“ ў Латгаліі. м. Дзьвінск, Віцебская вуліца, № 16.

Там-жа можна ўсё даведацца аб курсах.

Беларускі Аддзел.

АБВЕСТКА

Гэтым даводзіцца да агульнага ведама грамадзянства, што ў горадзе НЯСЬВІЖЫ аднавіласьвае зянятні пераходная Беларуска-расейская 8-клясавая жаноцкая гімназія Жаўнаркевіча.

У І і II клясах навукі выкладаюцца ў беларускай мове, а ў III—VIII кл. кл. — у расейскай.

Кіраўнік Гімназіі СЧАНСНОВІЧ

Г. Нясьвіж,
12—XII—1921 г.

Выбары у Сойм.

8. I. 1922 г. на ўсёй тэрыторыі „Сярэдняй Літвы“ адбудуцца выбары ў Віленскі Сойм.

Многа разоў мы пісалі аб гэтых выбарах, аб тым, што яны зусім неправідловыя, бо чамусьці адбываюцца на штучна выкраянай тэрыторыі, і маюць сваёю мэтаю далучэньне гэтай тэрыторыі да Польшчы.

Усе народы, якія жывуць на гэтай зямлі, апрача палякоў і то ня ўсіх, адмовіліся йсьці на выбары, бо калі-б хто пашоў на выбары, то тым самым ён як-бы прызнаў-бы правамоцнасьць Віленскага Сойму.

Устрыманьне ад выбараў беларусаў, ліцьвіноў і яўрэяў наносіць Віленскаму Сойму вельмі моцны ўдар. Правамоцнасьць яго, як устаноўчага сабраньня, зусім адпадае, бо ўсім ясна, што адны палякі становяць у Сярэдняй Ліцьве безварункову меншасьць.

Але можа стацца, што тым ці іншым спосабам паляком удасцца пацягнуць на выбары несьвядомую частку няпольскага насяленьня краю.

Гэта дало-б некаторыя козыры польскай палітыцы, якая-б тады сказала Лізе Народаў, што Сойм у Вільні рэпрэзентуе большасьць сярэдня-літоускага насяленьня.

Нам здаецца, аднак, што большасьці не зьбярэцца, бо гэта немагчыма.

Выбары павінны даць адказ, якая частка насяленьня падала галасы.

І калі-б аказалася, што за палякамі большасьць, то ў нашых вачох і такі Сойм, выбраны ў варунках уціску няпольскага насяленьня, ня меў-бы належнай вартасьці.

Так-бы павінна была аднесьціся да Віленскага Сойму і Ліга Народаў, але магчыма, што дзеля свайго спакою Л. Н. пройдзе моўчкі каля Віленскага Сойму і пытаньне аб Віленшчыне так і павісьне на больш-менш даўгі час у паветры, пакуль якія-небудзь падзеі міжнароднага значаньня ня высунуць яго ізноў на міравую арэну.

Пох.

Што чуваць у сьвеце?

Нямецкая кантрыбуцыя.

Ангельскі і францускі ўрады пастанавілі, што Нямеччына павінна ў 1922 годзе заплаціць кантрыбуцыю чатыры разы па 125 міліёнаў залатых марак. Тэрміны платы 15 студня, лютага, сакавіка і красавіка.

На Далёкім Усходзе.

Расейскія бальшавіцкія газэты пішуць, што белыя расейцы вядуць наступленьне на Далёкім Усходзе. Увесь паўночны ўсход ставіцца пад пагрозу белагвардзейскага ўдару. Сьледам за белымі йдуць японцы — „дзеля захаваньня парадку“.

У Петрапаўлаўск на Камчатку рыхтуецца цэлая ваенная экспэдыцыя з Японіі.

◆ У Пэкін выехаў прадстаўнік саветаў дзеля заключэньня абароннага хаўрусу Расеі з Кітаем на выпадак нападзеньня Японіі.

Індусы паўстаюць супроць чужаземнага панаваньня.

◆ Адчыняючы гадавую сэсію індыйскае мусульманскае лігі, старшыня яе сказаў, што 1-га студня 1922 года будуць агалошаны Злучаныя Штаты Індыі і заклікаў усіх да паўстаньня, скіраванага на вызваленьне ўсіх індыйскіх тэрыторыяў з-пад чужаземнага панаваньня.

◆ З Калькуты паведамляюць, што апошнімі днямі ангельцы арыштавалі 3.500 індыйскіх паўстанцаў.

Паўстаньне ў Эгіпце.

Паўстаньне ў Эгіпце супроць ангельскага панаваньня цягнецца далей і захоплівае шырэйшыя раёны. Порт-Саід і Суэц на ваенным палажэньні.

Ірляндыя ізноў неспакойна.

У некаторых мясцовасьцях Ірляндыі йзноў неспакойна. Здараюцца спатычкі паміж паліцыяй і ірляндзкімі незалежнікамі (сінфэйнэрамі).

Забастоўкі ў Нямеччыне.

У Нямеччыне адбываліся вялікія чыгуначныя забастоўкі.

Аўтаномія Сірыі.

Брыян заявіў у Парлямэнце, што Францыя ў блізкім часе дасьць аўтаномію Сірыі.

Паўстаньне на востраве Крыце.

Паўстанчы рух на востраве Крыце расьце. Паўстанцы дамагаюцца поўнай незалежнасьці ад Грэцыі. Начальнікам новае дзяржавы мае быць Вэнізэлос.

Аўтаномія Курдыстана.

У Курдыстане абвешчаны аўтаномны курдзкі ўрад. Паміж курдамі і пэрсамі адбыліся крывавыя спатычкі.

Аўстра-угорская спрэчка.

Вэнгерскія войскі занялі Шопронь 31. XII. 1921.

Незалежнасьць Крыма.

Са згоды маскоўскага ўраду, Крым агаласіў сваю незалежнасьць.

Паўстаньне ў Карэліі.

◆ Бальшавікі паслалі ў Карэлію 50.000 войска.

◆ Бальшавіцкія часьці пачалі наступаць на Пэркіярві. Лікам бальшавікі значна перавышаюць карэльскіх паўстанцаў.

Зьезд польскіх камуністаў у Маскве.

На зьездзе польскіх камуністаў, які адбыўся ў Маскве ў сьнежні месяцы 1921 г. пастаноўлена выслаць у Польшчу 36 найбольш спрактыкаваных агітатараў дзеля далейшае арганізацыі камунізму.

Расейска-эстонскі дагавор.

У Бэрліне савецкі прадстаўнік Ламаносаў і прадстаўнік Эстоніі падпісалі дагавор, паводлуг якога савецкі ўрад заказывае ў Эстоніі 200 паравозаў на суму 1.430 тыс. даляраў. Заказ гэты фінансуецца нямецкім банкам у Бэрліне.

Справы Савецкай Расеі.

◆ Дзевяты зьезд саветаў прызнаў добраю палітыку рады народных камісараў за мінулы год.

◆ Ленін на ўсерасейскім зьезьдзе саветаў заявіў, што саветы хочуць захаваць мір, аднак-жа, пры патрэбе будуць бараніць сваю рэспубліку да апошняе кроплі крыві.

◆ Зьезд саветаў пастанавіў зьменшыць лік чырвонае арміі, згодна з дакладам Троцкага.

◆ Як відаць з прамовы Троцкага на зьезьдзе саветаў, чырвоная армія пасьля рыжскага міру значна зьменшана і складаецца з 1.250.000 чалавек. 43 проц. афіцэраў не на патрэбнай вышыні па адукацыі, ане яны пэўны; сярод афіцэрства 33 проц. сялян і 12 проц. рабочых. Троцкі выказаўся за тое, каб палепшыць палажэньне вайсковых начальнікаў.

Красін у гутарцы з адным лёнданскім карэспандэнтам выказаў пэўнасьць, што Расея праз гадоў 15 будзе магчы заплаціць усе свае даўгі.

◆◆◆◆

Палітычныя весткі.

Гутарка Шардыны з Ластоўскім і Цьвікевічам.

КОЎНЯ, 19 сьнежня 1921 г. (Эльта) Старшыня міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі Ластоўскі і міністар загранічных спраў Цьвікевіч былі запрошаны прадстаўніком кантрольнай камісіі Лігі Народаў п. Шардыньі і мелі з ім гутарку аб Віленскай справе.

Яўрэйска-беларускі мітынг ў Коўні.

КОЎНЯ. 30. XII. (В. А. П.). У Коўні адбыўся яўрэйска-беларускі мітынг у пытаньні аб Віленскім Сойме. Тэатр быў перапоўнены. Мітынг адчыніў на яўрэйскай мове п. Шолам Вольф. Пасьля выступіў з прамоваю пабеларуску Цьвікевіч. Розэнбаўм гаварыў аб сітуацыі ў Вільні. Тады прамаўляў К. Душэўскі.

Апошнім гаварыў п. Горфінкель. Гаворачы аб яўрэях і Літве, ён скончыў заяваю, што яўрэі шчыльна зьвязаны са сваім культурным—цэнтрам—Вільняю, каторая павінна стаць цэнтрам літоўскага яўрэйства.

Мітынг ухваліў рэзалюцыю супроць выбараў у Віленскі Сойм.

◆◆◆◆

Фальсіфікацыя грамадзкай думкі ў Віленшчыне.

Увайшоўшае ў крытычную фазу палажэньне на Віленшчыне высунуло, дзякуючы стараньням палякоў, вядомага фальсіфікатара беларускай грамадзкасьці, П. Аляксюка.

Аляксюк атрымаў ня мала справядлівых атэстацый ня толькі ў беларускай, але і ў польскай прэсе, якая заявіла, што для палякоў—ганьба супрацоўнічаць з такою цёмнаю асобаю, як Аляксюк.

Свае выступленьні ў беларускай справе Аляксюк пачаў у складзе групы Скірмунта (група вялікіх землеўласьнікаў на Беларусі). Тут Аляксюк арганізаваў апазыцыю беларускім дэмакратычным элемэнтам і дамагаўся протэктарату Нямеччыны.

Праз тры-чатыры месяцы ён ужо быў заядлым староньнікам паразуменьня з бальшавікамі. У цяперашні час Аляксюк шчыры і ядзіны спаўніцель польскіх плянаў.

Пасьля таго як беларускае грамадзянства пачало рэзка адхіляць яго ад сябе, Аляксюк, згубіўшы апору сярод беларускіх палітычных кругоў, пачаў фабрыкаваць пры помачы і па інструкцыях сваіх гаспадароў, розныя арганізацыі, якія звычайна істнуюць толькі на паперы, але маюць аналёгічныя назовы з вядомымі ўсім беларускімі грамадзкімі арганізацыямі: ёсьць «Беларуская Нацыянальная Сувязь“ — Аляксюк фабрыкуе „Беларускую Краёвую Сувязь“, ёсьць „Беларускі Сялянскі Саюз“—Аляксюк фабрыкуе „Беларускі Сялянскі Хаўрус“, ёсьць „Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт“ — Аляксюк фабрыкуе „Віленскі Беларускі Нацыянальны Аддзел Краёвай Сувязі“. Тое самае робіць і з каапэратывамі.

Выдаючы ад імя сваіх, створаных з мэтаю фальсіфікацыі, фікцыйных арганізацый адозвы, дэклярацыі і інш. Аляксюк ашуківае гэткім спосабам, як беларускія апалітычныя элемэнты, так і грамадзкую думку заграніцай, якая слаба разьбіраецца і мала паінфармавана ў беларускім пытаньні, (Беларуск. Прэс-Бюро).

Жыцьцё у Савецкай Беларусі.

У № 402 за 28. XII. 1921 г. „Савецкай Беларусі“ знаходзім некалькі цікаўных абвестак аб культурным жыцьці ў Менску. Напрыклад:

Ад Менскага Таварыства Гісторыі і Старасьвеччыны.

У суботу, 31-га сьнежня г. г., а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні быўш. інстытуту Народнай Асьветы (Захараўская, 107) адбудзецца гадзічнае (адзінаццатае чарговае) пасяджэньне Таварыства.

Парадак дню.

1) Справаздача аб навуковай дзейнасьці Таварыства за мінулы год;

2) Прафэсар Пічэта.—Навейшая гісторыяграфія Беларусі.

Уход свабодны.

Пасьля пасяджэньня адбудзецца агульны сход сяброў Таварыства для выбару Праўленьня.

Часовае Праўленьне

Гадовыя каморніцкія курсы.

Згодна пастанове Савету Народных Камісараў Беларусі ад 17 сьнежня 1921 году, пры Беларускім Дзяржаўным Палітэхнічным Інстытуце адчыняюцца $1\frac{1}{2}$ годовыя каморніцкія курсы для падрыхтоўкі тэхнічных працаўнікоў па землябудаўніцтву.

На курсы нрынімаюцца мужчыны і кабеты ў веку ад 17 гадоў.

Для паступленьня на курсы неабходна вытрымаць калёквіум у абхваце курсу быўшых вышэйшых пачатковых школ.

Заявы аб прыняцьці на курсы прымаюцца ў канцэлярыі Палітэхнічнага Інстытуту ад дня распаўсюджаньня гэтай абвесткі і да 15 студзеня 1922 году.

УВАГА: заявы, якія падаюцца асабіста, прымаюцца ад 1 да 3 гадзіны дню (Адрэс інстытуту: Менск, Васілеўскі завулак).

Да заявы павінны быць прыложаны вось якія дакумэнты ў арыгінале ці зацьверджаных копіях: 1) пасьведчаньне аб асьвеце, 2) аб узросьце, 3) аб сацыяльным становішчы, 4) аб адносінах да адбыцьця вайсковай павіннасьці і 5) ўстановамі, командыровачнае пасьведчаньне.

Курсанты будуць здавальняцца за дзяржаўны кошт пайком і грашовай пэнсіяй.

Калёквіум скончыцца 20 студзеня 1922 году.

Загадчык курсамі.

Трупа драматурга Галубка.

2-я Беларуская трупа, якая працуе ўжо амаль што два гады, у 1921 годзе зрабіла ў культурным напрамку вялікую працу.

За 1921 год дадзена 150 спэктакляў па ўсіх клюбах м. Менску і ў павеце.

У Рабочым Беларускім Клюбе з гэтага ліку дадзена 76 спэктакля. („С. Б.“)

Беларусы ў Адэсе.

У Менскіх газэтах надрукована гэткае прывітаньне прафэсару Ігнатоўскаму ад беларускіх дзетак ў Адэсе:

Беларуская Дзіцячая Хата № 21 у Адэсе шчыра дзякуе Вам за тыя клопаты аб нас, дзяцёх, закінутых далёка ад роднага краю, і за тыя падарункі, якія нам надта прыгадзіліся ў чужой Адэсе.

Беларусы у Латвії.

Беларускі Аддзел і наша газэта.

Шмат беларусаў, жыхароў Латвії, даведаўшыся аб адкрыцьці Беларускага Аддзела пры Міністэрстве Прасьветы ў Латвії і аб яго мэтах, зварочваюцца к яму з просьбамі прыслаць беларускую газэту, каб з ёй пазнаёміцца. Выпісываць газэту з Вільні ў Латвію, асабліва ў глухую вёску, вельмі трудна: трэба ведаць каштоўнасьць латвійскага рубля ў польскіх марках і другія варункі загранічных зносін, чаго ў вёсцы не дапытацца ад людзей. Апроч таго, грошы на пошце ў Латвії для перасылкі ў Сярэднюю Літву ня прыймаліся. Дзякуючы гэтаму, „Беларускія Ведамасьці“, ідучы ў Латвію ў дужа значным ліку, шмат трацілі на сваіх коштах. Цяпер справа палепшала: усе латвійскія беларусы могуць падпісацца на нашу газэту, паслаўшы свой адрэс і падпісныя грошы ў Беларускі Аддзел пры Дэпартамэнце Прасьветы ў Латвії (Riga, Nikolaja Iela 36—a). „Беларускія Ведамасьці“ можна будзе таксама дастаць у кіосках ў Рызе.

Праца Беларускага Аддзелу.

Пад энэргічным кіраўніцтвам грам. С. Сахарава Беларускі Аддзел ў Латвії адразу павёў шырокую і пладатворна-прасьветную працу, заслужыўшы вялікую папулярнасьць (вядомасьць) і агульную спагаду сярод беларускага народу ў Латвії.

Няпрыхільную заметку аб кіраўніцтве Аддзела ў віленскім беларуск. календары на 1922 год трэба ўважаць за чародны выбрык лішня вольнага ў грамадзкіх адносінах аўтара календара (псэўданім Станіч) і недараваным недаглядам з боку паважанага Беларуск. Выдав. Таварыства.

Вучыцельскія Курсы.

Беларускі Аддзел ў Латвії адчыняе курсы для падрыхтоўкі беларускіх вучыцялёў.

Літоўскія справы.

Дэклярацыя літоўскіх яўрэяў.

На паседжаньні Літоўскага Сойму ў Коўні пасол Рахмілевіч прачытаў дэклярацыю яўрэйскай фракцыі аб Вільні, заяўляючы, што варшаўскія пляны захапленьня літоўскае сталіцы будуць зруйнованы.

Літоўскі універсытэт.

У заснованы літоўцамі Ковенскі Унівэрсытэт запрашаюцца з-за граніцы гэткія прафэсары, як Петражыцкі, Браун, Зялінскі і інш.

Уцекачы.

(Ад свайго карэспандэнта).

Баранавічы цяпер зьяўляюцца адным з галоўных цэнтраў, праз які варочаюцца з Расеі ўцекачы. Ад паўстаньня гэтага пункту да цяперашняга часу праз Баранавічы прайшло каля 350-400 тысяч народу. Аграмадную большасьць гэтых уцекачоў складаюць беларусы, пераважна праваслаўныя, сяляне—земляробы Гарадзеншчыны (60-80 проц.) і Віленшчыны, пакінуўшыя сваю гаспадарку і бацькаўшчыну перад пагрозай нямецкае навалы. Ня гледзячы на 7 гадоў жыцьця ў Расеі, яны добра захавалі сваю родную мову і гавораць выключна пабеларуску. Інтэлігенцыі сярод іх надта мала, а калі ёсьць, дык больш яўрэйская.

Адарваныя ад сваей хаты і зямелькі, пасьля доўгіх гадоў бадзяньня па чужых кутох, скуль іх заўсёды цягнула да роднае хаты, уцекачы варочаюцца на бацькаўшчыну... Але тая крыжавая дарога, якая пачалася для іх у 1915 г., ня скончылася і цяпер.

Бальшавікі падвозяць уцекачоў толькі да ст. Стоўпцы, дзе проста выкідаюць іх за дэмаркацыйную лінію, часта выкідаюць ўжо трупамі. Выкінутых забірае польская ўлада. Падбіраньне гэнае вядзяцца так нерэгулярна, што ўцекачы па некалькі дзён застаюцца пад голым небам, ува ўсякую пагоду, чакаючы пакуль іх не забяруць—і мруць, асабліва ў марозы. Нікім непадабраныя трупы ляжаць доўгі час на голай зямлі.

Ад Стоўпцаў уцякачоў перавозяць у Баранавічы і памяшчаюць у бараках—голыя, халодныя муры (дах, вокны і і печы парабілі толькі на Каляды). Штодзенна ў гэтых бараках, „стайнях“, як іх празвалі, у немагчымай цеснаце месьціцца да 10-х тысяч чалавек уцекачоў—ўдвая больш, чым зьмяшчаюць „стайні“. Бывала, што зьбіралося іх 25—30 тысяч. Калі не хапае месца ў „стайнях“, дык уцекачы трымаюць пад голым небам, на абшары ў некалькі дзесяцін, агарожаным калючым навет у самыя вялікія марозы.

У бараках няма ніякага догляду за парадкам, калі ня лічыць некаторых даглядальшчыкаў, кіруючых уцакачамі з пугаю ў руках. Змучаныя сваім палажэньнем людзі прадстаўляюць з сябе нейкіх сьценяў, апатычных, забітых, без сваей волі і ініцыятывы. Бываюць сыйшоўшыя з розуму. Страшная цесната, холад і голад даюць добры грунт для пашырэньня заразьлівых хвароб, можа ўжо прывезеных з Расеі. Сярод уцекачоў пануе тыфус ува ўсіх сваіх відах, малярыя, цынга, крываўка... Сьмяротнасьць надта вялікая. У часе марозаў памірала па 200—300 чалавек ў дзень—за ўвесь час памёрла некалькі тысяч. Выміраюць цэлыя сем'і. Найбольшая сьмяротнасьць прыпадае на долю слабейшых: дзяцей ад 1—15 гадоў і старых ад 50—80 гадоў.

Санітарнаю справаю на пункце кіруе польская інстытуцыя N. N. K., якая наладзіла за ўвесь час 1 шпіталь на 200—300 чалавек, мае лазьні, па выхадзе з каторых людзі, як мухі, мруць на холадзе; робіць прышчэпы розных хвароб, дэзынфэкцыю адзежы і хавае трупы. Але ўсе гэтыя меры не дасягаюць мэты, дзякуючы антысанітарнасьці пункта, скапленьню людзей, хваробам, пачаўшымся яшчэ ў дарозе, нядбальству... Характарызуючым доказам будзе прыклад: з эшалону ў 1300 чалавек уцекачоў, прыбыўшых з Саратава ў Баранавічы, засталося ў жывых толькі 512 чалавек.

Агульнае кіраўніцтва і тэхнічная работа па рэвакуацыі належыць „komitetu opieki jeńców, uciekaczy i robotników“ ці J. U. R. Прыехаўшы ў Баранавічы, кожны уцекач дае ў J. U. R. на праверку свае дакумэнты, і адтрымоўвае карткі: на прабыцьцё ў „стайнях“, на лазьню, на карыстаньне сьнеданьнямі і на права ехаць у сваё роднае месца.

З рэшты дабрачынных арганізацый, якіх у Баранавічах ёсьць даволі, найбольш памагае ўцекачам Амэрыканскі Кам. Помачы Дзяцём, выдаючы 3.000 — 5.000 абедаў у дзень і вопратку дзяцём.

Кажучы праўду, у Баранавіцкіх арганізацыяў хапілоб-ы сілаў памагчы ўцекачам і толькі хіба адсутнасьць жаданьня, нядбальства, а можа быць яшчэ нешта горшае, падобнае ў некаторых выпадках да злой волі, перашкаджае ім зрабіць гэта.

Зьезд паўнамоцнікаў Віленскага Саюзу Каапэратываў.

28 сьнежня адчыніўся зьезд паўнамоцнікаў Віленскага Саюзу Каапэратываў. На зьезд прыехала каля 120 паўнамоцнікаў ад 72 таварыстваў і 1 саюзу. Адчыняючы зьезд, Старшыня Часовай Урадуючай Камісіі Саюзу гр. Краскоўскі прачытаў прывітаньне зьезду ў беларускай мове, посьле чаго яно было прачытана ў мовах: польскай, літоўскай і яўрэйскай. Старшынёй зьезду выбраны: кс. Адам Станкевіч, намесьнікамі: доктар Зарцэн, Трабша і Каразія, сэкрэтарамі: Стацкевіч і Канчэўскі.

Яшчэ не пачалася праца зьезду, як адзін вучасьнік яго — звольнены Радай Саюзу інструктар Вольскі, ўчыніў скандал. Задаўшы пытаньне Старшыні зьезду: „Па якому праву тутака прысутны і гаворыць быўшы сябра Управы Чыжэўскі“? — Вольскі назваў гр. Чыжэўскага і ўсю быўшую Управу „машэньнікамі“. У салі паднімаецца страшэнны шум. Паўнамоцнікі крычаць: „вон яго!“, „ісключыць яго!“ У гр. Чыжэўскага зьезд просіць выбачэньня, хоць староньнікі Вольскага з гэтым і не згаджаюцца.

Посьле абедзеннага перарыва зьезд пераходзіць да выслуханьня даклада Рэвізыйнай Камісіі. У дакладзе ёсьць шмат драбязы, якая нікога ня цікавіць, па глаўнаму-ж пытаньню, аб якім апошні час было так многа гутарак і пісалася ў газэтах, высьвятляецца: што быўшая Управа 1. IX. залажыла ў прыватнай асобы 200 пудоў цукру з 480, атрыманых ад Дэпартамэнту Аправізацыі і аб гэтым паведаміла Дэпартамэнт Аправізацыі: аб закладзе цукру быў зроблены дагавор, згодна з якім Управа мела права выкупіць цукер да 1. XI, але ў назначаны тэрмін ня выкупіла, і цукер астаўся ў купца. Усім таварыствам, якія зьяўляліся па цукер, іх доля акуратна выдавалася. Гэта ўсё было-б нічога, але адзін сябра Управы—Паўловіч, бяз ведама другіх, напісаў рахункі на цукер, як быццам выдадзены таварыствам, якія не зьяўляліся ў Саюз, цукер заложаны ня выкупіў у пару, бо захварэў на тыфус. Старшыня Рэвізыйнай Камісіі—сьвяшчэньнік Бляяеў быў на кватэры ў хворага Паўловіча і той прызнаўся, што ён адзін фальшаваў дакумэнты бяз ведама іншых сябраў Управы, што іншыя сябры Управы ведалі толькі аб закладзе цукру. Адначасна Рэвізыйная Камісія ствердзіла, што асабістай карысьці ні ў кога з быўшых сяброў Управы ня было, і ўсе грошы паступілі ў касу Саюзу.

З даклада Рады відаць, што яна таксама не знайшла віны ўсей быўшай Управы (апроч Паўловіча) і ствердзіла толькі нарушэньне каапэратыўнай тактыкі, вызванае цяжкімі варункамі жыцьця Саюзу.

З дакладаў быўшых сяброў Управы відаць, што Вольскі, паступіўшы працаўнікам у Саюз, вёў падкоп пад самы Саюз, каб так ці інакш яго зруйнаваць, бунтаваў працаўнікоў, узяўшыся за злучэньне Віленскага Саюзу з Саюзам „Ziemi Wileńskiej“—хацеў фактычна зьніштожыць Віленскі Саюз, а стварыць штось „сваё“—новае, ўвёў у Саюз нацыянальную нязгоду і палітыку, хацеў у негандлёвым аддзеле зрабіць нацыянальныя сэкцыі і шмат іншага.

Цікава тое, што калі праз 7 дзён пасьля канца срока дагавора аб закладзе цукру (7. XI.) Вольскі, Цыбулька і Штангэ заявілі Рэвізыйнай Камісіі, дык як па згавору, ў гэты самы дзень, Дэпартамэнт Апрaвізацыі напісаў паперу пракурору аб неправідловым падзеле цукру Саюзам.

З прамовы Вольскага, поўнай розных абражаючых для быўшых сябраў Управы выразаў, бадай што нічога новага да таго, што ён ўжо пісаў у газэтах, ня высьвятляецпа. Між іншым цікава прызнаньне Вольскага, што перад ад'ездам сваім з Варшавы ён меў нарады з каапэратарамі (Мельчарскі, Гімпэль), на якіх абгаварываўся плян „працы“ Вольскага ў Віленскім Саюзе.

У спрае дзейнасьці быўшай Управы было ўнесена тры рэзалюцыі: Бэдназовіча, быўшага працаўніка Саюзу, асуждаючая Управу ў духу Вольскага; Турчыновіча, быўшага сябры Управы Віленскага Саюзу, ў якой гаварылася аб невядома якіх нарушэньнях пастапоў быўшых зьездаў. Абедзьве гэты рэзалюцыі прыняты ня былі. А прайшла (За: 50 галасоў і процію: у аднаго лічыўшага 22, а ў другога 24 галасы), рэзалюцыя доктара Зарцэна, ў якой гаворыцца, што зьезду дзейнасьці быўшай Управы ня відзіць злой волі.

Рэзалюцыяй засталіся незадаволены часьць паўнамоцнікаў, і правадыр іх — Вольскі посьле перарыва забраў голас, каб зрабіць новый скандал. Пачаўшы абражаць увесь зьезд, што ён пакрываець праступленьне, дапусьціў рад выкрыкаў, за якія Старшыня Зьезду лішае Вольскага голасу. У салі паднімаецца страшэнны шум і крыкі: „вон“, „правакатар“ і інш. Вольскі кідае Старшыні на стол нейкую паперу, крычыць: „Агласіце“. Гр. Вялецкі падбягае да выходзячага з салі Вольскага і штось крычыць яму, Вольскі крычыць на Вялецкага, але што, дык за агульным крыкам нічога ня чуваць.

Вольскі са словамі: „за мной!“ даходзіць да дзьвярэй і абарачываецца. За Вольскім выходзіць толькі інструктар „Związku Ziemi Wileńskiej“. Пан Цыбулька нейкі час астаецца ў салі, разам з інструктарам Стражы Крэсовай—Уступскім бярэць на чарадзе за рукавы сваіх староньнікаў і іх цягнець да дзьвярэй. Тыя ня ведаюць, што рабіць.

Урэшце выходзіць 5—7 паўнамоцнікаў, але скора некаторыя з іх варочаюцца назад.

Зьезд вядзе далей мірна працу. Разглядаецца даклад Часовай Урадуючай Камісіі і зацьвярджаецца. Прыступаюць да выбараў Управы з 3 асоб. Выбраны: Краскоўскі, Платакіс, Пяткевіч: кандыдатамі: Мілайкоўскі і Вялецкі.

На трэці дзень зьезд спакойна займаўся дакладам аб будучай дзейнасьці Саюзу, і заслухаў рад дробных прапазыцыяў паўнамоцнікаў. Перад зачыненьнем зьезду ксяндзу Адаму Станкевічу былі зроблены авацыі і дзякавалі за добрае вядзеньне зьезду.

С. Чыжэўскі.

„Эканамічны Сойм“.

Такім імем запраўды можна назваць Надзвычайны Зьезд паўнамоцнікаў Віленскага Саюзу Каапэратываў, які адбываўся ў Вільні 28—30 сьнежня.

Тутака зьехаліся 94 прадстаўнікі нашае вёскі—прадстаўнікі арганізованага дзеля эканамічнае працы сялянства. І калі мы прымем пад увагу, што прадстаўленыя сваімі... дэлегатамі саюзныя каапэратывы злучаюць ня менш як 40.000 бацькоў сямей, што яны гэткім чынам зьвязуюць каля 200.000 душ едакоў (лічучы сярэдня па 5 асоб у сям'і) дык значэньне Зьезду стане нам зусім ясным.

Значэньне гэтае—вялізарнае. Пад той час, як увесь наш край дагэтуль не здалеў адхапіцца пасьля страшэнное руіны, да якой давяла сямілетняя крывавая вайна на нашай Зямлі, — сялянства, яшчэ нядаўна стаяўшае на найніжэйшай ступені грамадзкае арганізацыі, сваімі ўласнымі сіламі, бяз ніякае помачы з боку тэй ці іншай улады, а навет пры няпрыхільных адносінах апошняе, здалела згуртавацца, здалела знайсьці супольную дарогу, здалела палажыць першы камень пад будову свайго эканамічнага дабрабыту. І мы з гордасьцю павінны сказаць, што гэту вялізарную працу зрабіла пераважна беларускае сялянства, што як-раз на долю беларускіх грамадзкіх працаўнікоў выпала чэсьць быць тым цэмэнтам, які спаяў гмах сялянскае каапэрацыі ўсяго краю.

Зьезд выявіў запраўднае нацыянальнае аблічча краю, паказаў, што аснаўную масу насяленьня яго становяць беларусы. Але сьвядомасьць сваей лічэбнай перавагі не здалела зьвясьці беларускіх каапэратараў з тае дарогі, па якой павінен ісьці і ідзе запраўды дэмократычны сялянскі народ. Беларусы стварылі Саюз, — але стварылі яго ня выключна для сябе, а для ўсіх жыхароў краю бяз розьніцы нацыянальнасьці. І Зьезд, з поўнай сьвядомасьцю гэтага, ня гледзячы на пераваге на ім беларусаў, ясна і цьвёрда заявіў сваё „верую“, стануў на грунце згоднага і солідарнага супрацоўніцтва ўсіх краёвых нацыянальнасьцей — на роўных правох, як роўны з роўным. Зьезд, маючы перад сабой ня хутка мінаючыя і зьменныя палітычныя мэты, а выключна супольную справу ўсіх спажыўцоў, паклаў у аснову будовы краёвае каапэрацыі аб'яднаньне ўсіх спажыўцоў бяз розьніцы нацыянальнасьці. А гэтае сваё „верую“ выявіў найбольш ярка на выбарах Управы Саюзу, ў склад якой увайшлі: беларус, літвін, паляк і жыд.

Мала таго: Зьезд паказаў, што, ня гледзячы на ўсе палітычныя сваркі і грызьню аб тыя ці іншыя „орыентацыі“, якія разьбіваюць сілы краёвага грамадзянства, ёсьць магчымасьць супольнае творчае працы ўсіх нацыянальнасьцей краю, калі ёсьць сьвядомасьць супольнае карысьці. Каапэрацыя як-раз такую сьвядомасьць разьвівае. Гэта — школа грамадзкага жыцьця, і тыя пакаленьні, якія ў гэтай школе ўзгадуюцца, знойдуць спосаб згодна разьвязаць ня толькі эканамічныя, але і палітычныя пытаньні.

Сойм палітычны дыктуе законы, на якіх дзяржыцца ўся дзяржава. Выканаўчая ўлада гэныя законы праводзіць у жыцьцё, карыстаючыся сілай. Наш „эканамічны Сойм“ так сама падыктаваў закон, на якім павінна дзяржацца нашае эканамічнае жыцьцё: гэта—вялікі закон роўнасьці і брацтва народаў. І хоць нямашака ў нас выканаўчае ўлады, няма тае фізычнае сілы, якая прымусіла-бы ўсіх грамадзян пільнавацца гэтага закону,— мы верым, што ён выключна сваей моральнай сілай знойдзе дарогу да сэрц усіх праўдзівых сыноў краю і здабудзе агульны послух.

Г. Б.

Агульныя выбары.

Зьезд паўнамоцнікаў Віленскага Саюзу Каапэратываў, ня гледзячы на тое, што задачы яго, як зьезду надзвычайнага, былі вельмі абмяжованы і абыймалі фактычна выбары новае Управы і зацьверджаньне пляну дзейнасьці на будучыну, вызваў агульную цікавасьць і набраў значэньня важнага здарэньня ў грамадзкім жыцьці краю.

Тлумачыцца гэта перш-на-перш тым, што Зьезд павінен быў сказаць сваё важкае слова аб тым нягодным цкаваньні проці Саюзу, якім у працягу блізу двух месяцаў займаўся на страніцах „гасьціннай“ польскай часопісі „Gazeta Krajowa“ пан Вольскі і ягоная хэўра; да таго-ж Зьезд зьбіраўся напярэдадні Сойму, у самы гарачы час перадвыбарнае агітацыі, і на ім зышліся разам вольна, запраўды дэмократычна выбраныя прадстаўнікі арганізаванага ў каапэратывах насяленьня ня толькі „Сярэдняе Літвы“, але і з-за межаў яе (з-пад панаваньня Польскай Рэчыпосполітай).

На зьезьдзе былі прадстаўлены ўсе нацыянальнасьці Краю, былі і ўсе тыя, якія ўстрымаліся ад пасылкі сваіх паслоў у Сойм. У перапоўненай салі Работніцкага Дому побач з сутанамі ксяндзоў можна было бачыць чорныя вопраткі праваслаўных сьвяшчэньнікаў, сялянскія кажухі пераметаваліся з чорнай адзежай мястовых людзей; з трыбуны і ў салі чутны былі ўсе краёвыя мовы. Тут запраўды зьдзейсьніўся той вялікі палітычны кліч, аб якім шмат хто многа гаворыць, хоць і не выпаўняе яго: „вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі“!

І гэтым Зьезд апраўдаў агульнае зацікаўленьне ім з боку палітыкаў.

Пераходзячы цяпер да тае работы, якая зроблена Зьездам, трэба з шчырым здаваленьнем сказаць, што Зьезд здалеў з гонарам выйсьці з таго цяжкога палажэньня, ў якое з гэткім адумам і з гэткім стараньнем паставілі яго тыя, што імкнуліся абярнуць Саюз Каапэратываў ў паслухмянага служку польскага нацыяналізму, або, калі гэта ня ўдасцца, разьбіць Саюз. Усе спробы паноў Вольскіх і Уступскіх вывясьці Зьезд з раўнавагі, распаліўшы нацыянальную розьнь, і на гэтым грунце правясьці свае палітычныя пляны ці сарваць Зьезд,—усе гэтыя спробы разьбіліся аб спакойнае, дзелавое настраеньне паўнамоцнікаў, якія зьехаліся з цьвёрдым жаданьнем ачысьціць каапэрацыю і Віленскі Саюз Каапэратываў ад тых брудаў, якія благія людзі вылівалі бяз ніякае прычыны ня толькі на ўсіх сябраў старое Управы — агулам, ня шукаючы вінаваўцаў, але і на Раду Саюзу і Рэвізыйную Камісію. І Зьезд ачысьціў атмасфэру, ачысьціў Саюз моральна, ачысьціў яго і ад тых людзей, якія ўвайшлі да яго ня дзеля творчае працы, а дзеля чужых для каапэрацыі мэтаў.

Гэтае настраеньне Зьезду зусім выразна выявілася пры галасаваньні рэзалюцыі аб пераходзе ад справаздачы старой Управы да чародных спраў. Вялізарнай большасьцю галасоў была прынята рэзалюцыя доктара Зарцэна, што „ў-ва ўсіх дэфэктах дзеяльнасьці старое Управы Зьезд ня бачыць злой волі“ і прызывае сабраных да дзелавой працы. Гэта быў адказ пану Вольскаму і яго хаўрусьнікам на ўсе іх напасьці і лаянкі; гэтым Зьезд выразна засудзіў нягодную работу і йшчэ больш нягодныя спосабы работы гэтых паноў.

Ясна, што пасьля памененай рэзалюцыі панам Вольскім і Уступскім ня было чаго далей аставацца на зьезьдзе, які паказаў што ня дасьць сабе абаламуціць. І яны былі прымушаны пакінуць З'езд, а за імі выйшлі з салі і дэлегаты шасьцёх каапэратываў.

З гэтага мамэнту нішто больш не псавала работы Зьезду. Спакойна і з развагай былі прыняты важныя прынцыповыя і дзелавыя рэзалюцыі, якія, разам з выбарамі новае Управы і агульным становішчам Зьезду, далі яркі доказ таго, што Віленскі Саюз Каапэратываў, ня гледзячы на ўсе старыя дэфэкты прыпадковага характару, стаіць на здаровых, моцных асновах, што ён становіць аб'яднаную, пранікнутую шчыра-каапэратыўным духам арганізацыю, здольную абараніць каапэрацыю ад унясеньня ў яе нацыянальнай і палітычнай барацьбы. Зьезд паказаў, што Саюз гэты запраўды правёў у жыцьцё ідэю так званае „Краёвасьці“, абапертую на ўзаемнай пашане і прызнаньні раўнапраўства ўсіх нацыянальнасьцей краю.

Б—скі.

Агляд Друку.

Значаньне беларускага селяніна пры выбарах у Сойм.

У № 293 ад 18. XII Ковенскага „Эха“ зьмешчаны артыкул С. Розэнбаўма, каторы абгаворваючы ўчасьце і заслугі яўрэяў у справе будаўніцтва Літоўскай дзяржаўнасьці і ў прыдбаньні Літве сымпатый сусьветнага яўрэйства, —падходзіць да Віленскай справы.

Ен знайходзіць, што:

„Тут значаньне яўрэяў як нязначнай меншасьці, далёка ня гэтак вялікае, як значаньне беларусаў, складаючых значную большасьць насяленьня. Шмат хто з яўрэяў можа быць будзе нездаволеньнены гэтым зьмяншэньням іх ахвяр і заслугаў, але... сказанае будзе ясна, калі прымем пад увагу, што пытаньне аб Віленскіх выбарах можна ставіць ня так аднабочна: прыняць ці ня прыняць учасьця ў выбарах.“

Па яго погляду:

Л. Родзевіч.

Багаты і бедны.

(Сценічны абразок ў аднэй дзеі з пяяньнем).

АСОБЫ.

1) Ганка — маладая дзяўчына.
2) Васіль — дзяцюк.
3) Паляўнічы — пажылы, але маладзіцца.

Рэч дзеецца ў лесе летам.

Ганка. (зьбірае ягады і пяе: „Пашла дзеўча за грыбамі“.) У часе пяяньня разварачывае жбанок з ягадамі). Ах, рассыпала ўсенькі! Абышла я ўвесь лес, пазьбірала поўны жбанок, а ўсё нехапала, а ўсё было мала. І вось няўдача... Змарную цяпер нямала часу. А тут трэба да хаты сьпяшыць, матулі памагаці... (Зьбірае) Гоп, гой, лесавік ці хохлік, памажэце суніцы зьбіраць! Ха-ха-ха...

Васіль (вылазіць з кустоў). Я тут, Ганка!

Ганка. Ух!.. Як з-пад зямлі вырас... Чаго снуеш ты па лесе?

Васіль. Ганка, няўжо я табе так надакучыў? За што ты мяне зневажаеш?

Ганка. Ой, яшчэ цяпер сэрцайка чуць ня выскача!

Васіль. Я тут, бачыш, у зарабках — дровы сяку ў лесе. Раптам чую галасок твой, — ось быццам салавейка заліваецца. А дзеля таго што я песьні надта люблю, — кінуў сячы дровы і прыбег сюды.

Ганка. Калі так, дык нечага марудзіць. Памагай во бяду бядаваць, а я табе за гэта падзякую.

Васіль. (зьбірае). Ты толькі міргні сваім вочкам, дык я ў пекла скочу, ня то што ягады зьбіраць. Але смашныя ягадкі пасьля тваіх ручак — салодзенькія...

Ганка. Ах ты ласун! Дык ты іх ясі?!

Васіль. Я, Ганачка, шкадуючы цябе, каб табе лягчэй было нясьці.

Ганка. Ах ты гэткі: сваю суседку крыўдзіць уздумаў! Сам папрабуй зьбіраць... Пакланіся кожнай ягадцы, разгарні травіцу, раз ступі ды азірніся, пашукай ды йзноў пакланіся, ды цярпі, каб ня зьесьці ягадку. Скеміў?

Васіль. Эх, Ганачка, што да гэтага, дык ты ў мяне можаш навучыцца. Вось я цябе знашоў, пакланіўся. І ягадка ты — добрая, а вось мушу цярпець, цмокаць, глядзець ды аблізывацца.

Ганка. Дык вось: каб сьлюнкі не цяклі, дык адвярніся ды ідзі да сваей работы.

Васіль. Эх, бяда! Як убачу я цябе, дык нацешыцца не магу; а як пачую тваю дражлівую гутарку, дык вось, здаецца, зямля растпаецца ў мяне пад нагамі...

Ганка. Вось, маеш табе — жменю ягад адчэпнага і ня жалься на мяне.

Васіль. (Пяе)

Як пачну аб табе думаць,
Тады думкі так прыгожы,
Як букет з пахучых красак,
І так чыстыя, як сьлёзы.
Дзе-бы я не павярнуўся,
Куды вокам я ня кіну,—
Ты стаіш перад вачыма
Усюды, ў кожную часіну.

Ганачка, што мне зрабіць, каб ты мяне пакахала хоць трошачку так, як я цябе.

Ганка. А на што табе гэта здалося?

Васіль. Бо я бяз гэтага звар'яцею! (хоча абняць).

Ганка. (Адпіхае Васіля) Ты, я бачу, ужо звар'яцеў. Хочаш, мабыць, каб ізноў рассыпала ягады.

Васіль. Ой, у сэрцы мне пячэ...

Ганка. Ну, дык ідзі пашукай крыніцу ды акуніся...

Васіль. Ганка!

Ганка. Не палходзь! Калі хочаш вешацца, дык ці мала ў лесе сукаватых асін? Мне мілей дзявочая воля, як ты! О, каб ты быў прыгожы ды багаты каралевіч... тады я сама да цябе прыгарнулася-бы... Хоць ня ведаю, мо'з часам што лепшага пачуеш, — пачакай!.. (Выходзіць).

Васіль. (Пяець)

Чакай сьвятога ніколі
Ганка! я табе чужы —
Пашкадуй, памажы...
Ганка! сэрца мне баліць,
Як мне цяпер жыць?
Ганка гоніць ад сябе, —
Раніць сэрца мне.
Цёмны бор, прашу цябе —
Прыгарні мяне.

(Выходзіць; песьня сьціхае).

Ганка. (Уваходзіць. Заклапочаная) І кудой-жа мне дамоў прайсьці?! Гэты дзяцел закруціў мне галаву, сваімі песьнямі ды жальбамі. А тут як на бяду і сонейка схавалася за хмары (Прыглядаецца ў бакі). Ніяк не згадаю, у які бок кінуцца?.. Але што-ж мне рабіць, заблудзілася я. Ой нехта страшны йдзе, прапала я... Каб дзе схавацца... (Хаваецца за куст).

Паляўнічы. (Уваходзіць з стрэльбай. Згледзіў Ганку, каторая сядзіць схаваўшы твар у фартушок). Паляваньне удалося! Козачка, што ты тут робіш?

Ганка. (Хліпае).

Паляўнічы. Пакажы сваю дзюбачку, да якіх птушак ты належыш?

Ганка. Я заблудзіла. Мне трэба ісьці да хаты.

Паляўнічы. Ат, пасьпееш... Але як я бачу, дык ты рэдкая птушачка (Хоча ушчыкнуць).

Ганка. Не чапайце!

Паляўнічы. Ого, недатклівая!

Ганка. Да душы кажу, што і жбанка не пашкадую!

Паляўнічы. Бач, якая адважная! Калюча, як крапіва. Ну, ня злуйся, маё каценятка! Я не такі дрэнны, як табе здаецца. Маеш табе шпільку з майго шалічка, — брылянтам дарагім аздоблена яна. Дай ушпілю табе у грудцы, каб...

Ганка. Не хачу я вашай шпількі, адчапіцеся! Дзе дарога да вёскі Дубраўляны?

Паляўнічы. Ат, што мне вёска Дубраўляны! Вось у мяне горшая напасьць: стрэліў у лісіцу і хібіў на паўцалі, ня болей. А пекная лісічка была... Але такой бяды, — за яе адкажыш ты.

Ганка. Крычаць буду!

Паляўнічы. Крычы сабе, ніхто не пачуе.

Ганка. Божухна мой, што рабіць? Гэта, пэўне, чорт перакінуўся ў паляўнічага...

Паляўнічы. Не, рыбка, я не чорт, а пан Бядноцкі, палюю за зьвярамі, лаўлю вось гэткіх, як ты матылькоў, смашна ем, доўга сплю і зянятым аднэй думкаю, каб як весялей пражыць дзень, а кожны пражыты дзень, — як складны куплет; а вось прыпеўка за яго:

Жыцьцё гэта:
Песнь, кабета,
Хмель манета,
Ізноў кабета!

Хоць бывае, што часамі не шанцуе, як нядаўна: хібіў і лісічка ўцякла. Але няма ліха без дабра. Ня маю лісічкі, дык маю цябё. Вось толькі ня ведаю, як ты завешся.

Ганка Адстаньце!.. І ў якім-жа баку мая хатачка?

Паляўнічы Канстанцыя! Вось ак! Былі ў мяне Багусі, Маргэты, Марысі, Праксэды, Гапкі, Стэпкі, але Канстанцыі ня было. Дык вось-жа цяпер будзе... (Зьнімае стрэльбу, прыстаўляе да пня і паючы прыпеўку ловіць Ганку)

Ганка Людцы, ратунку! Ай, ай, ратунку!..

Васіль (Прыбягае, хапае стрэль-

47

„...можна пайсьці на выбары бяз ніякага ваганьня, стварыць беларуска—яўрэйскі зьліты блёк — стварыць у гэткі спосаб залітоўскую бальшасьць.“

Зьніштожыўшы гэтай большасьцю польскія надзеі на Сойм — абвесьціць непадзельнасьць Літвы. У доказ магчымасьці гэтага аўтар прыводзіць тое, што сярод палякоў у Вільні няма ўжо гэтакай суцэльнай еднасьці.

„Адныя толькі Н-дэкі, якія, праўда, складаюць большасьць польскага насяленьня, падгрымоўваюць польскія дамаганьня. Але ёсьць і другая досьць значная група — фэдэралістаў, каторыя стаіць за злучэньне з рэштаю Літвы хаця-бы на падставах аўтаноміі.“

Гэткім спосабам:

„Беларусы, яўрэі і палякі—фэдэралісты будуць складаць такую паважную большасьць, што Н—дэкам прышлося-б пашкадаваць аб склікаваньні Сойму.“

Але тут зьяўляецца галоўнае пытаньне—

„Ці будуць беларусы скрозь галасаваць за Літву?

Дзякуючы разумнай палітыцы, Пурыцкіса, беларуская інтэлігенцыя з малымі выняткамі за нас (Літву), што яскрава выявілася на зьездзе ў Празе.

„Але нічога або мала было зроблена для таго, каб даць гэтай інтэлігенцыі магчымасьць доступу ў народную гушчу, арганізаваць гэтую гушчу, растлумачыць ёй значаньне народных пытаньняў, растлумачыць ёй, чым была і чым будзе для яе Польшча, што справа Літва-Польшча ёсьць пытаньне зямлі і хлеба, пытаньне свабоды або паншчыны“.

Свае развагі аб значаньні беларусаў у справе выбараў у Сойм Розэнбаўм канчае заяваю, што:

„Як бы там ня было, цяпер лёс і значаньне віленскага Сойму залежаць не ад яўрэяў, а ад беларускага селяніна, ад яго здаровага інстынктыўнага і інтуітыўнага разуменьня і ад долі ўплыву на яго інтэлігенцыі“.

Як відзім, аўтар разважае зусім слушна, але бяручы для выбараў нармальную абстаноўку. Пры тых-жа варунках, у якіх склікаецца Сойм цяпер, сьвядомасьць нашага селяніна і ўплыў на яго нашай інтэлігенцыі ня так ужо шмат значаць. І уплыў і сьвядомасьць знаходзяцца пад тым прэсам, пры якім Сойм ня мае абсалютна ніякага значаньня.

Ш—ка.

II
Становішча Беларусі.

Украінская газэта „Рідны Край“ у навагоднім нумары ў аглядзе сусьветнай палітыкі за 1922 г. піша:

„Рыскі трактат аддаў у панаваньне Польшчы значную часгку Беларусі і Валыні, якія Польшча інкорпоравала і сьпешна праводзіць у гэтых краёх цэнтралізацыю, ня гледзячы на тое, што вызначаныя ў рыскім трактаце граніцы ня ёсьць акачальнымі з дзьвюх прычын: 1) бальшавікі ня прызнаюць граніц у „буржуазным“ разуменьні гэтага слова, 2) вэрсальскі трактат устанавіў пэўныя ўмовы вызначэньня ўсходняй граніцы Польшчы, якія абмінуў рыскі дагавор“.

„Беларусь, якую падзялілі між трыма суседзямі, Польшчаю, Літвою і Сав. Расеяй, змагаецца за сваё аб'яднаньне і вызваленьне з пад чужацкай апекі. Нацыянальны рух прыбірае тут усё больш яскравых форм і стараньне беларусаў на культурным полі давялі да паважных рэзультатаў. Надта шкодзяць усходнім беларусам бальшавіцкія рабункі, аднак, яны цярпліва зносяць гэтае ліха, бо маюць больш нацыянальна—культурнай волі, чым іх браты на захадзе. З гэтай прычыны заходнія беларусы з вялікаю сімпатыяй паглядаюць на Усход, дзе яны маюць навукова—прасьветныя заклады і могуць адраджаць сваю культуру. Часткаю гэта ёсьць пасьледствы хітрай бальшавіцкай палітыкі, якія хвілёва абдягчаюць долю ўсходніх беларусаў, каб прывабіць да сябе адарваных заходніх братоў.

✦✦✦✦

Расейска-польскія адносіны і Літва з пагляду ковенскай прэсы.

Ковенская газэта „Эхо“ ў аднэй з астатніх сваіх перадовіц піша:

„Вось рад даных апошняга дня, сярод каторых амаль што немагчыма знайсьці злучаючую лінію агульнага ходу падзей: 1) Польшча выразна рыхтуецца да вайны з Савецкай Расеяй, пацярпеўшы навет няўдачу у інсьпіраваным ёю паўдзённа-пэтлюраўскім націску; 2) ёсьць за надта многа даных, гаворачых аб тым, што Расея таксама рыхтуецца да гэтай вайны лічучы, яе нямінучай; 3) адносіны паміж Сав. Расеяй і Фінляндыяй пагоршаны да магчымага разрыву (артыкул пісаны да разрыву—Рэд.); 4) адначасова с перагаворамі Лёйд-Джорджа з Красіным, гаворачым аб прызнаньні Савнаркома, ў Сыбіру рэзка адзначаецца японска-амэрыканская згода.

Усё гэта гаворыць аб тым, што толькі хіба якое-небудзь палітычнае дзіва ня дасьць вясною раз'юшыцца вайсковай калатні, пасярод якой бяз сумлеўку будзе Расея і, аб чым ня можна ня ведаць, бязумоўна і Польшча. Калі гэты прогноз хоць-бы трохі справядлівы, дык з якога пагляду яго не абгаварываваць, ён аднолькава-ж небасьпечны для Літвы. Мець побач сябе поле вайны, асабліва гэткае цэнтральнае як віленская тэрыторыя, бяз конца жудасна і згубна для будучыны. Для Літвы небасьпечны кожны пераможац у будучай вайне—бо язык перамогшага, якім з намі будуць гаварыць, падарве і нутраное жыцьцё краю. Што-ж рабіць, калі лічыць факт вайны нямінучым?

Рыхтавацца да яго і вышукаваць спосабы таго моцнага і поўнага нейтралітэту, ўзмоцненага салідным гарантыямі, каторы даў бы магчымасьць мірнай дзяржаве, не жадаючай карыстаць з чужой бойкі, ня несьці на сабе і яе цяжараў“.

Камэдыя.

Орган украінскіх с.-дэмакратаў „Вперед“ піша:

Некалькі дзён назад адбыўся плебісцыт у Шопроні і ў ваколіцах гэтага места. Правесьці гэты плебісцыт, як ведама, парашылі на канфэрэнцыі ў Вэнэцыі, каб гэткім спосабам унікнуць непаразуменьня між аўстрыйскаю рэспублікаю і Вэнгры яй-з-за так званага бургэнляндзкага пытаньня.

Бургэнлянд, які знайходзіцца ў заходняй Вэнгрыі і заселены ў большасьці немцамі, на падставе дыктоўкі Антанты меўся прыпасьць рэспубліканскай Аўстрыі. Каб не дапусьціць да гэтага, вэнгэрская рэакцыя надта ўмела зрабіла вядомае паўстаньне ў Бургэнляндзе. Паўстаньне гэтае выклікало агульнае абурэньне ў цэлым сьвеце. Усе бачылі ў гэтым неапраўданы ўчынак Вэнгрыі, ўсе былі надта абураны дзеямі бандаў Геяса, якія ў кароткім часе дужа зьнішчылі спрэчную тэрыторыю, і навет урады Антанты прымушаны былі заняць супроць гэтага рашучае становішча.

Аўстрыя не хацела тады вайны. Не хацела з дзьвюх прычынаў. Першае,—верыла, што без праліцьця крыві ўдасца ёй атрымаць, хаця-бы па самай справядлівасьці чыста нямецкую тэрыторыю і што пастанова Антанты будзе споўнена. Другое, аўстрыяцкая буржуазія са сваімі сымпатыямі была на старане Вэнгрыі. Гэта ёсьць характэрыстычны мамэнт, бо дужа ясна высувае клясовы мамэнт у аўстрыяцка-вэнгерскім канфлікце.

Устнаваньне Аўстрыі як незалежнай дзяржавы надта труднае. Захады, каб злучыцца з Нямеччынаю, асудзіла Антанта, і ёсьць усе даныя, што яна гэтага злучэньня не дапусьціць. Тады паўстала другая думка — аднаўленьне аўстрыяцка-вэнгэрскай дзяржавы з Габсбургам на чале. Думку гэтую высунулі якраз аўстрыяцкія манархічныя, сацыяльна-хрысьціянскія кругі. Яны верылі, што толькі пры помачы Вэнгрыі, пры помачы сыстэмы белага тэрору дыктатара Горты ўдасца ім вярнуць стары лад.

Але й гэтага праекту ня удалося зьдзейсьніць, ізноў дзякуючы спраціўленьню як вялікай, так і малай Антанты.

Напад банд Геяса быў скіраваны ня толькі проці Аўстрыі, але наагул проці рэспубліканскага ладу. З гэтай прычыны работнічая кляса Аўстрыі першая падумала аб абароне сваёй бацькаўшчыны і да гэтай абароны прымусіла ўрад. Толькі дзякуючы становішчу аўстрыяцкай арміі, якая ў большасьці праняласа сацыялістычным духам, удалося стрымаць напор вэнгерскіх банд. Як правадзіла гэтую абарону бацькаўшчыны аўстрыяцкая буржуазія, пра гэта шмат навін прынясла сацыялістычная прэса Аўстрыі, аб гэтым сацялістычныя дэпутаты ня раз падыймалі пытаньне ў парлямэнце і розных камісіях. Вэнгерска-Аўстрыяцкая рэакцыя была пераможана работніцкаю клясаю.

Пад клічам абароны свабоды й рэспублікі прыступіла аўстрыяцкая сацыялдэмакратыя да плебісцытнай акцыі. Праца была ня лёгкая. Тэрор вэнгерскіх банд у часе плебісцыту збольшыўся. Агітацыя была выключана. Вэнгерскія рэакцыянэры сілаю разьбівалі зборкі, нападалі й білі прыхільнікаў Аўстрыі, фальшавалі сьпіскі галасаваньня, словам, рабілі ўсё, каб толькі затрымаць ласы кавалак пры Вэнгрыі.

Калі прымем пад увагу, што плебісцыт у Шопроні й ваколіцах меўся адбыцца ў два тыдні па выхадзе з гэтай тэрыторыі вэнгерскіх войск, а па праўдзе яго правялі толькі праз два дні па выхадзе вэнграў, калі дадамо, што італьянскія войскі сталі на бок Вэнгрыі, дык убачым, што пэўная перамога Аўстрыі была немагчыма. Аўстрыяцкія сацыялісты верылі, што здабудуць якіх 70% галасоў. На праўдзе перамагла Вэнгрыя.

Плебісцыт у Шопроні і яго рэзультат, гэта доказ, як добрая падстава можа быць зьдзейсьнена ў розных абставінах і якое значаньне можа мець тэрор. Шопронскі плебісцыт стаў звычайнаю камэдыяй. Перамагла не падстава, ня слушнасьць, але вэнгерскі кулак. Аўстрыяцкая буржуазія ў душы пэўна радуецца гэткім вынікам, бо гэта ляжало ў яе душэўных плянах,—для аўстрыяцкага пралетарыяту гэта, аднак цяжкі ўдар.

Калядная вечарына.

Стары Язэп сваей жонцы
Давай талкаваці:
„Гэта-ж сьвята ўнас, Каляды,
Трэба пагуляці.
Пазавём таго-сяго мы,
Зробім вечарыну,
Вінцук наш ужо вялікі,
Ды й маем дзяўчыну.
Сваё мяса і гарэлка, —
Няхай пагуляюць
Нашы дзеці і суседзяў,
Бо-ж ахвоту маюць“.
І пашоў Вінцук на вёску
Хлапцоў называці,
А Магдуся пасьпяшыла
Дзяўчат запрашаці.
Незадоўга ўсё гатова —
Тут і музыканты,
І дзяўчата ўсе прыбраны,
А хлапцы дык франты.
Скрыпка, клярнэт і цымбалы
Разам заігралі.
Хлапцы дзяўчат між сядзячых
За рукі пабралі.
Яны трохі чырванелі,
Хацелі ўпірацца,
Баючыся, што з іх часам
Гатовы сьмяяцца.
Але скора пасьмялелі
Пашлі танцы ў волю,
Пасядалі — хто на лавах,
А хто у камору.
Дзе ні глянь-ўсюды па двое,
А ўсё штось талкуюць
Пазіраюць, чы іх часам
Суседзі пачуюць?
Пятрук кажа: „Чуеш, Юлька,
Будзем мы жаніцца“.
А Вінцук: „Мая Ганулька,
Каб нам разам зжыцца“.
Юлька кажа: „Пачакаем,
Няхай пройдзе сьвята.
А Ганулька — „Ня ведаю,
Як мой скажа тата“.
Саўсім скора — аж за поўнач
Час ім апыніўся,
Як Язэп рыжабароды
Між імі зьявіўся.
— „Годзе, кажа, дзеткі мілы,
Для вас танцаваці.
Трэба сталы, бач, уносіць
Будзем выпіваці“.
Хлапцы кажуць: „Дзякуй дзядзька,
Мы ня хочам есьці“.
А дзяўчаты: „Ляпей далей
Будзем танцы весьці“.
І ня доўга ім прышлося
Гэту спрэчку весьці,
Бо сталы былі гатовы,
Бо селі піць — есьці.
— Ежце, кажа Язэп, дзеткі,
Сабе не шкадуйце.
Вашы годы маладыя —
Гуляйце жартуйце.
Па гульбе што вас чакае,
Павінны вы знаці —
Гэта, дзеткі залатыя,
Трэба працаваці.

Падаў Янка Макрыца.

Засьц. Монкі. Стаўпецк. пав.

бу і цэліцца ў Паляўнічага) Стой, бо кулю ўсаджу!

Паляўнічы Разбойнік, не страляй. За што? Набой гэты для зьвера назначаны... Ты памыліўся — я пан.

Васіль О, шкаднейшага зьвера няма...

Паляўнічы Эй ты няўмека, апусьці дула ўніз—з гэтым ня жарты... Чуеш? О Божа, ён на мушку ўжо бярэ. Вазьмі ўсё маё багацьце. Усім, чым хочаш надзялю... Ой, гвалт забіць ён мяне хоча.

Васіль Маліся, калі Бога маеш... Я чакаю, (апускае стрэльбу).

Паляўнічы. Бяры сабе ўсё маё багацьце і пакінь ты гэтыя выкрутасы. Патрэбен ты тут, як дзірка ў мосьце. (Кладзе на пень грошы).

Васіль. Добра! (Бярэ грошы). Цяпер я буду прыгожы і багаты каралевіч, бо за мазольную працу саетаў ня справіш.

Ганка. Нечага сьмяяцца, бо табе ня шкодзіла-б свае латы замяніць на цэлую вопратку.

Паляўнічы. (Хлопае ў далоні) Брава! Залатыя словы.

Васіль. (Пяе)

Надзеўшы латаныя латы,
Я вышаў з курнай хаты...
Пагарджаю дар я гэты. (адкідае пану грошы)
Не патрэбны мне саеты!

Паляўнічы. Ха-ха-ха... Нічога і твае песьні не памагаюць. Дзяўчына ані-ні, як мур. Бо да дзяўчат трэба інакш падлабупівацца..,

Васіль. Але, інакш! І вось дзеля таго, шаноўны ягамосьцю, стань на калені перад ёй і прасі прабачэньня за крыўду, якую ўчыніў і закажы дзеткам і ўнукам сваім каб не заступалі дарогі дзяўчатам... (Ізноў бярэ на мушку) Ну, раз, два...

Паляўнічы. (У бок) Цьфу ты напасьць, і нічога не зрабіш, прыдзецца стаць. (Стаў на калені, да Ганкі) Прашу выбачэньня за крыўду, якую ўчыніў і закажу дзеткам і ўнукам, каб... (ускаківае) Ды што гэта я раблю! Глупства ўнукі, але што скажуць на гэта мае гордыя дзяды і прадзеды... Аддай стрэльбу!

Васіль. Аддаў-бы гэтае ламаччо, але пан па дурнасьці сваей мяне яшчэ заб'еш.

Паляўнічы. Дык забій мяне бо ня ў змогу мне гэткі зьдзек і паняверa! (Робіць позу) Страляй, страляй!

Васіль Але! Ратуючы Ганку, мушу прабіць тваё трухлявае сэрца.

Ганка. Стой! Здурнеў! Хіба ня ведаеш, што на том сьвеце за гэта цябе пекла чакае.

Васіль. Хай чакае—усюды мне пекла без цябе. (Пяе)

Сэрца — поўная каханьня,
Мазоль здобіць мае рукі,
Душа, шчырая сьціпная
І гатова на ўсе мукі.

Паляўнічы

Маю гонар, маю грошы,
Сыты, франт я і харошы,
Кабет, часу шмат я маю.
Роскаш, радасьці ўсё знаю.

Абое

Дык скажы, дзяўчынка міла,
Што у лесе зблудзіла;
Багацей, мілей хто будзе,
Тваё сэрца хай разсудзе.

Ганка. (Абнімае Васіля) Васілёк мой даражэнькі!

Васіль. Ганачка шчасьцейка маё! (Выходзяць абняўшыся)

Паляўнічы. Браў то я лісічку добра на мушку, але як стрэліў, дык хібіў на паўцалі, ня болей.

ЗАСЛОНА.

Карагод.

Жывей бяжыце, хлопцы! Музыка, ў дудку грай. Сьпяю я з вамі песьню: жыві наш родны край! Вун гай ў кветкох бялее і разьлівае пах, ад гукаў сэрца млее і б'ецца у грудзях. Паслухай крык зязюлькі, і сьвісты салаўя, і кумнаньне жабулькі, вясёлы плюск ручча... І мы ўсе засьпявайма!.. Музыка, ў дудку грай! Як мы цябе ўсе любім, наш беларускі край Няхай наш гук ўзаўецца у сіню вышыню .. Мы дружна тут ўхваляем вясёлую вясну! Вун пчолы і ўсе мошкі у грамадзе гудуць, над ліпаю зялёнай свой карагод вядуць. Іх гук, як звон гітары, ляціць із вышыні, нясецца аж за хмары гімн яснае вясны. Музыка, праў-жа дудку! Зрабем зноў карагод. Язэп, дзяржыся пары... Пятрусь, ідзі ўпярод! Хто болей дасьць нам шчасьця, як родненькі наш край?! Народ наш беларускі, са шчасьцям ўвек вітай! Жывей бяжыце, хлопцы! Музыка добра грай! Наш родны, наш прыгожы! Цьвіці ўвек, мілы край!

Юзік Хрышчановіч.

У Сэрбіі.

Тручанай мухай хаджу... і сьпяваю.
Хто ні спаткаецца—з тым гаманю.
Слова вясёлага, ласкі шукаю.
Крышачку хочацца знаць пра маю
Мілую вёску... што з ёю здарылась?
Там-жа стаць ці яе разьняслі—
Хто куды мог і каму як прысьнілась?..
Нешта пайшоў недахват на зямлі!
Іншы раз возьмеш газэту у рукі:
Можа што пішуць пра вёску маю?
Надта абрыдла ад гэтай прынукі—
Изноў варажыць, дзе я долю саўю?
Цягне да хаты... Там бацька застаўся,—
Тут-жа мне цяжка, адзін я лаўлю—
Хто што ні кажа, абы не сьмяяўся...
Трэба-ж чым жыць,—я і так шмат ня сплю.

М. Запольскі.

На матыў „Хаўтурнага Марша“.

Гукі прыгожыя марша хаўтурнага
Ціха ў паветры імглістым плывуць...
Сэрца са сьвету халоднага, хмурнага
У край невядомы, далёкі вядуць..
Гукі дрыжаць... гукі плачуць... губляюцца...
Гукі растуць... рвуцца... стогнам канчаюцца...
З імі і сэрца дрыжыць:
„Досі ўжо, досі ўжо жыць!“
— „Кінь ты жыцьцё ладарванае, сумнае,
З доляй змагацца — ўсё роўна ня час!
Сэрца-ж тваё, як засьнець, неразумнае,
Скажуць і людзі: „І гэты загас!“
Гукі хаўтурнага марша згаджаюцца
З гэтаю доляю... Чуеш: змагаюцца
Быццам з жаданьнямі жыць?
— „Досі ўжо!“ сэрца дрыжыць...
— „Досі, чаго ты шукаеш прыгожага?
Сьветлыя думкі, надзеі — мана...
Толькі блісьнець шчасьце зоркай і што-жа?
— Глянеш, — ужо і загасла яна...
Досі... а гукі дрыжаць, надрываюцца,
Плачуць, а потым ізноў разрастаюцца.
Лісьць пажаўцелы у тон ім шуміць:
„Досі ўжо, досі ўжо жыць!“
У тэй невядомай краіне за хмарамі
Вечная ціша... спакой... вечны сон
Сэрцу, што жыцьця закранута марамі,
Там яно, сумнае, сьціхнець, як стогн...
Там толькі гора нячутна жыцьцёвага,
Сонца ласкавага, сонца маёвага
Вечна сьвятло там гарыць...
„Досі ўжо, досі ўжо жыць!“
Гукі прыгожыя марша хаўтурнага
Ціха ў паветры імглістым плывуць.
Сэрца са сьвету халоднага, хмурнага
У край невядомы, далёкі вядуць.
Гукі дрыжаць... гукі плачуць... губляюцца,
Хваляй на могілках зноў разьліваюцца
З імі і сэрца дрыжыць:
— „Досі ўжо, досі ўжо жыць!“

Натальля Арсеньнева.

Пісьмо з Вільні.

II.

Дарагі Вінцэська! Ня маю часу, браток, адпісываць, і рукі ў мяне няпрывычныя. Найгорш посьле пілоўкі. Я наймаюся пілаваць дровы з ліцьвіном, Жвірблісям. Ен служыць за стоража ў той камяніцы, дзе жыве лысы пан Пяткевіч. Мы з Жвірблісям пасябравалі, разам пры дровах зарабляем, бо з гэтай пэнсіі дык і сабака не пражыве. У нашай камяніцы гаспадар жыд, але ён жыве, казалі, недзе заграніцай, у Бэрліне, ці ў Заблудаве. За яго упраўляе тут ягоны зяць, Іцка, малады жыдок. Любіць на мяне крычаць,: чаму не замецена, чаму тое ня так, сёе ня так... Я кажу яму: Трэба грошы, дошкі патрэбны на масток, бо тыя пагнілі і адна завеса пры браме пэнкла“. Дык ён ізноў на мяне, што я вінават. Бадай ты прапаў! Я кажу яму: „Чаму не даеш мне лепшай кватэры? вун, са сьценаў цячэ.“ Дык ён мяне вон праганяе. „Пачакай ты, падла, думаю я сабе: як будуць надзяляць зямлю, кіну службу ды пайду ў вёску“. Каб я меў родную хату, кусок зямлі, дык вот жыў бы! А так чалавек прападаеш за нішто. Мой Андрэйка вучыцца надта добра, аж той лысы пан Пяткевіч хваліць. Учора Жвірбліс мне кажа, каб пайсьці да касьцёла да сьвятога Мікалая, бо там той ксёндз, што ў беларускай гімназіі вучыць, дык ён навуку гаворыць папросту. Я кажу жонцы: „Ты ідзі сабе на шостую да сьвятога Якуба, а я пайду на дзесятую да сьвятога Мікалая, а цябе пушчу на нешпар, куды сабе захочаш“. Дык яна—не! Але я упёрся і на маім стала. Сягоньня нядзеля. Я прыходжу з Андрэйкам да Мікалая: крышку зьдзівіўся, бо там грамада дзяцей і нейкіх паноў. Я спачатку не паверыў Жвірблісю, што ксёндз навуку гаворыць папросту, аж тыкі праўда-папросту! Чытае Эвангелію: „Езус казаў вучням сваім: дапраўды, гавару вам: калі ты будзеш запрошаны на вясельле, не сядай на першым мейсцы...“ Я думаю сабе: „Ці Пан Езус так папросту гаварыў бы? Але ксёндз цэлую навуку сказаў папросту, так як мы ў хаце гаворым, або як я да цябе пішу. Вышаўшы з касьцёла, мы ішлі да хаты з тым лысым панам Пяткевічам, дык ён кажа, што Пан Езус папросту не гаварыў так, як мы цяпер гаворым, але і папольску не гаварыў. „Дык як-жа Пан Езус гаварыў“? я пытаюся. Аж пан Пяткевіч так мне растлумачыў: „У тыя часы, як Пан Езус жыў, былі дзьве мовы ў жыдоўскай зямлі: адна навучная, а другая простая. Дык Пан Езус да простых людзей гаварыў у простай тамашняй мове. Яго ўсе лёгка разумелі, але вучоныя і багатыя ня любілі, што Пан Езус братаўся з простым народам“. Бывай здароў, Вінцэська! Ужо ня можна пісаць, бо газа у лямпе дагарэла, а гаспадар электрычнасьці да мяне перавесьці ня хоча.

Твой Сымон з Вільні.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Агітацыя панскіх наймітаў.

Толькі што прыбыўшыя сяляне з Барун (Ашмянскага пав.) передаюць нам нябывалыя рэчы аб аляксюкоўскай там рабоце. Аляксюкоўскі наймiт Бэкіш, агітуючы за Аляксюка, заўсёды маець пры сабе гарэлку і закуску, якой частуе сялян, каб яны пашлі на выбары і падалі свой голас за Аляксюка.

Апрача таго, Бэкіш, езьдзячы па вёсках, лжэць, цьвердзячы, што на выбары ідуць вядомыя беларусы кзяндзы: А. Станкевіч, Пятроўскі і інш. Робіцька гэта Бэкіш дзеля таго, каб абманам прымусіць сялян пайсьці на выбары.

Але дарэмна! Сяляне добра пазнаюцца на гэтым ашуканстве; адны з іх паказваюць Бэкішу дэкрэт, дзе гаворыцца, што подкупам нельга намаўляць да выбараў, другія проста гоняць вон такіх аляксюкоўскіх лгуноў і ашуканцаў, а іншыя ўзноў прыяжджаюць у Вільню і тут даведваюцца, што аляксюкоўцы лгуць і што праўдзівыя беларусы на выбары ня йдуць.

Падбарунскі.

Адносіны да безьзямельных.

(Рудомінская гміна Віленскага павету.)

Малазямельныя й безьзямельныя нашай гміны падалі ў 8 выбарчы вокруг, у які ўваходзяць 6 гмінаў нашага павету, у тым ліку й наша, свой сьпісак. У сьпіску выставілі толькі аднаго кандыдата — грам. Янку Александровіча, сумленнага й вядомага ў ваколіцы чалавека. Сьпісак падпісалі 52.

Старшыня выбарчай Камісіі, мабыць нежадаючы, каб безьзямельныя мелі свайго прадстаўніка ў Сойме, выкасаваў з гэтых подпісаў — 7, як быццам не знайшоўшы іх у сьпісках выбаршчыкаў. А гэтыя людзі ўсімі знаныя сталыя жыхары нашай гміны; Харужас — уладар дому ў Рудоміне, Буэль Вінцук — солтыс, Янук і Антаніна Кавалеўскія — жыхары в. Татарка, Стафанія Драгуновіч, Р. Даўговін, Мікалай Юрэвіч.

Такім чынам, дзякуючы недахвату, патрэбнага ліку подпісаў (трэба 50) гэты, сьпісак не зацьверджан Камісіяй.

Відзячы такую справу, народ кажа што на выбары ня пойдзе, ды баіцца каб яшчэ большага чаго ня было.

Выбаршчык.

Перад выбарамі.

(Міцкунская воласьць Віленск. пав.)

У нас цяпер па ўсей гміне раз'яжджае цэлая хмара агітатараў за выбары.

Яны добра ўмеюць карыстаць з цёмнаты нашых несьвядомых людзей і то страхам, то абяцанкамі хочуць да сябе прыгарнуць, хоць гэта ня вельмі ім удаецпа. Нядаўна прыяжджаў нейкі быццам „ужэнднік“ і наказаваў людзям каб галасавалі толькі за Польскі Цэн. Кам. Выбарчы, а хто ня будзе галасаваць, таго пацягнуць у суд або аштрафуюць.

Народ тутэйшы глядзіць на выбары ў Сойм зусім зімна; бо-ж і кажуць: „гэтыя соймы ня раз ужо скліcаліся, нічога добрага ад іх спадзявацца ня можна.“ Большасьць людзей ня пойдзе на выбары.

Для Аляксюкоўскай агітацыі тут няма мейсца, бо людзі добра знаюць яго прадажную работу на згубу Бацькаўшчыны. Сяляне з в. Адамчукі высылалі на Аляксюкоўскі зьезд дэлегатаў, каб яны сказалі там сваё слова праўды, але дэлегаты гэтыя ня былі прыняты і яшчэ зьняважаны і выдалены з салі зьезду.

Наагул сяляне цяпер страцілі надзею на палепшаньне свайго быту і перасталі верыць розным польскім абяцанкам.

У Навaградчыне.

З усяго відаць, што ў нас, у Навагрaдзкім павеце, праводзіцца прынцып польскіх паноў-эндэкаў—„сполёнізаваць беларусаў за 50 гадоў“. Гэты прынцып асабліва старанна і мэтодычна намагаецца праводзіць школьны інспэктарыят. Люднасьць наша скоілася бяз школы, дзеці растуць без асьветы,—і інспэктарыят школьны ахвотна адчыняе ў беларускіх вёсках... польскія школы. Няма тэй вёскі з значным лікам жыхароў, каб там ўлада школьная не пастаралася адчыніць польскую школу. Толькі дробныя вёскі не ашчасьцены накіненай ім польскай школай і прыезным з Польшчы паляком-вучыцелем.

Праўда, люднасьць беларуская выганяе ад сябе паляка-вучыцеля. але-ж за плячмі яго стаіць усёмагутны жандар, рэвіровы,—і людзям добра „даецца ў знакі“ нежаданьне іх „ісьці ў палякі“. Ня пускаць дзяцей у польскую школу—наражацца на кары рэвіровых, якія ў гэтым вялікія майстры: і „падводная павіннасьць“ не ў чаргу, і пагроза высылкай, як бальшавіка... І ня пікні нідзе аб крыўдах. а то будзеш у Кракаўскай цытадэлі! Жыцьцё, скажу Вам; сьмяротнаму ворагу свайму не пажадаеш гэткай волі і роўнасьці.

Усё-ж, ня гледзячы на ўвесь уціск, сяляне варожа адносяцца да насланых сюды польскіх вучыцялёў з Конгрэсувкі і ўсімі способамі стараюцца гэта выяўляць. Каб такую паласу настрояў сялянства беларускага як-небудзь спыніць, школьны інспэктарыят пусьціўся на хітрыкі: вучыцялямі ў польскія школы назначае мясцовых людзей, якія з сялянамі маглі-б гутарыць пабеларуску. Але школа ўсё роўна лічыцца польскай, навука для беларускіх дзетак выкладаецца выключна папольску, і толькі ў рэдкіх выпадках, дзе люднасьць асабліва дамагаецца беларускай школы, дазваляецца вучыцелю тры гадзіны ў тыдзень заняцца пабеларуску.

Вялікі сучасны пэдагог, польскі школьны інспэктар Навагрaдскага павету, лічыць зусім пэдагогічным, каб навука ў пачаткавай школе адбывалася ў чужой для дзяцей мове, а родную мову каб дзеці вучылі толькі як прадмет і ня больш 3-х гадзін з 24 тыднёвых лекцый ў школе.

Але гэтага мала. Асобным „okólnikiem“ гэтага пэдагога вучыцялі, навет мясцовыя, абавязаны ў школьных гадзінах ужываць у гутарках з дзецьмі толькі польскую мову.

Людцы добрыя! Парадзьце, што рабіць? Дыхнуць вольна ня можна. Вучыць сваіх дзетак на нашай роднай мове ня маем мы права, мы—адвечныя жыхары Навагрaдчыны. Закладаем мы патаёмныя беларускія школы для сваіх дзяцей, але гэтыя школы пад заўсёдным страхам, вучыцель пад пагрозай арышту.

І чаму гэткі уціск, гэткае ліха выпала на наш павет? Няўжо ўлада польская хоча ў першую чаргу нас перарабіць на палякаў? Але няхай не спадзяюцца: мы не паддамося. І напрасна яны, паны-палякі, трацяць тут міліёны сваіх марак. Пажаданых для сябе вынікаў яны мець тут ня будуць.

С.

У Лідчыне.

У нашым Лідзкім павеце справа з беларускай асьветай чым далей, тым горш. Тыя вёскі, якія падалі польскаму школьнаму інспэктару даўно ўжо прыгавары з просьбамі аб адчыненьні беларускае школы, спадзяваліся, што а можа-ж і зьмілуецца пан інспэктар, а можа-ж хоць пасьля Каляд дзеткі будуць вучыцца. Мысьлілі сяляне, што інспэктарыят школьны, заняты адчыненьнем польскіх школ у беларускіх вёсках, ня мае часу заняцца іншымі школамі і дзеля гэтага адцягавае разгляд заяваў аб беларускіх школах. А інспэктарыят тым часам, напіхаючы польскіх вучыцялёў усюды, зьбіраў спраўкі аб беларускіх вучыцялёх — кандыдатах, каб знайсьці фармальныя прычыны і ня даць дазволу на беларускую школу. Дэлегацыі ад сялян да інспэктара кожны раз чуюць ад яго, што справа яшчэ „nie zbadana“ і трэба яшчэ пачакаць. Доўга чакалі сяляне і ўрэшце дачакаліся... адмоўных адказаў. Калі фармальных прычынаў пры гэтым вымысьліць было немагчыма, дык... вінавата кандыдатура вучыцеля, асабліва калі ён родам з тэй самай вёскі, адкуль прыйшла заява аб беларускай школе. Вядома, гэткі вучыцель можа мець найбольшы ўплыў на сялян, дык, значыцца, ён небясьпечны ў гэнай школе, а дзеля гэтага „отвод“, як і ў часы царскага рэжыму. Ды цяпер інспэктару яшчэ лягчэй: ахрысьціў вучыцеля „bolszewikiem“ — і гатова. Далейшыя гутаркі аб беларускай школе адразу спыняюцца, бо і самая вёска бярэцца тады на падазрэньне: „bolszewicy!“ Калі гэты вучыцель дбаў аб беларускай школе ў сваей вёсцы і пры бальшавікох, дык хоць-бы ён дастаў цяпер абяляючае яго пасьведчаньне ад самога ксяндза, навет паляка, усё роўна ён—„bolszewik“, і школа беларуская адчынена быць ня можа. Адна вёска ў нас зусім ужо пэўна была, што школа будзе адчынена: да самых падрабязгаў усе фармальнасьці былі споўнены, вучыцель бяз жаднага падазрэньня.. Раптам—адмоўны адказ. Вучыцель Патапчык Тодар дастае ад школьнага павятовага інспэктара за №, пячаткай і ўласнаручным подпісам інспэктара, што школа беларуская ня можа быць адчынена ў яго вёсцы і Патапчык ня можа быць у ёй вучыцелем, бо ён „працаваў ў асьвеце пры бальшавікох і дзеля гэтага інспэктарыят ня можа быць пэўным ў яго лойяльнасьці да польскае ўлады“.

Спрытна! Адразу—і вучыцель—ня вучыцель і школа ня будзе адчынена.

Р.

Пажары.

✦ Нядаўна ў в. Кавалі Вязынскай вол., Вялейск. пав., згарэла ўся маемасьць пяцёх гаспадароў. — С. Саха,

✦ Начою з 2 на 3 сьнежня (дзекабра) 1921 г. ў в. Ярмолічы тэй-жа воласьці згарэла маемасьць чатырох гаспадароў. — С. Саха.

Пошасьць на сьвіней.

✦ У Вязынскай воласьці Вялейскага павету напала нейкая пошасьць на сьвіней. У некаторых гаспадароў паздыхалі ўсе сьвіньні. — С. Саха.

Няшчасны пагарэлец.

✦ З пагарэўшых у в, Ярмолічы Вязын. вол., Вялейск. пав., дужа пацярпеў гаспадар Міхал Соніч. Гэтага году памёр у яго апошні сын 26 гадоў, памёр зяць, пакінуўшы жонку з дзяцьмі, здох конь, а цяпер згарэла ўсё. Згарэў і новы дом, каторы будавалі, меўшыся жаніць сына. Дом быў саўсім гатовы, і

78

ў яго меліся на сьвяты пераходзіць. Гэтаму гаротніку, М. Сонічу, за 70 ужо гадоў. — С. Саха.

Пануе тыфус.

У Вязынскай вол. Вялейск. пав. і дагэтуль пануе тыфус розных відаў. Шмат людзей паўмірала, а мэдыцынскай помачы няма. Аб гэтым ужо пісалася ў „Беларускіх Ведамасьцях". Застаецца толькі дадаць, што каму трэба паставіць банкі (адно лякарства ў вёсцы), дык трэба ехаць за 7 вёрст да раённага доктара па дазвол, бо фэльчар без яго запіскі, пад страхам 3 месяцаў арышту, ня мае права даць хвораму і гэтага ратунку. — С. Саха.

Выбары ў гміннную раду.

На выбары ў раду Вязынскай гміны Вялейскага пав. прыяжджаў рэфэрэнт з Вялейкі, але кіраваў выбарамі тутэйшы абшарнік пан Гіцэвіч. Са сьпіскамі выйшла прыкрая гісторыя. Выстаўленымі аказаліся кандыдаты, аб якіх выбаршчыкі й не ўспаміналі, а тыя, каторых выбаршчыкі паставілі першымі, аказаліcь па сьпіску апошнімі. Ад насяленьня 10.000 чалавек было 140 выбарчшчыкаў,з іх 20 ня прыйшлі. Згаварыліcь галасаваць толькі за сваіх, а выбраным аказаўся пан Гіцэвіч і той, хто яму падабаецца... Уся валасьць дзівіцца, якім гэта чынам сталася? Цікаўна адзначыць, што рэфэрэнт і Гіцевіч гаварылі паміж сабою панямецку (калі хацелі, каб выбаршчыкі іх не зразумелі).

С. Саха.

Канстытуцыя толькі на паперы.

Польская вучыцелька ў м. Вязыні Вялейскага павету навучае праваслаўных дзяцей хрысьціцца пакаталіцку і чытаць каталіцкія малітвы. Пішам аб гэтай справе ўжо другі раз.

Як адбывалася перапісь у Дзісеншчыне.

Настаўнік польскае школы пан Хайноўскі перапісываў каталіцкія в ё с к і Баяры і Мікіцёнкі, Гармана ў с к а е гміны, з карабінам за плячом. Ен намаўляў пісацца палякамі, страшыў, пагражаў, лаяў „judaszami — zdrajcami ojczyzny" (юдамі—зраднікамі бацькаўшчыны), а ўрэшце, як ня мог даць ніякай рады, пісаў тое, што сам хацеў.

Наезныя кіраўнікі перапісі (інструктары) былі здаволены працай пана Хайноўскага і злосна накідаліся на тых перапісчыкаў, якія запісывалі беларусаў беларусамі, а не палякамі.

У каталіцкай в ё с ц ы К а н ц ы сяляне сьвядомыя, і запісаліся яны беларусамі. Інструктары прыяжджалі туды некалькі разоў, каб намовіць беларусаў запісацца палякамі.

Запісаўшы толькі адну хату, яны не здаволіліся гэтым і ўжо пасьля вызначанага для перапісі тэрміну (3-га кастрычніка) паехалі туды яшчэ раз і гвалтам перапісалі ўсіх людзей палякамі.

У з а с ь ц е н к у К л у ш ы н ы сям'ю Якімовіча і ў з а с ь ц е н к у Б а р с у ч к і сям'ю Аношкі, каторыя запісаліся беларусамі і не згаджаліся перапісацца на палякоў, інструктары завочна перапісалі (як шляхту) палякамі.

Тое-ж самае зрабілі з сем'ямі Шыпілы і Альшэўскага, каторыя жывуць на мала-дастyпных стругах Я л е н с к а г а М о х у за 8—12 вёрст ад сухога берагу.

У в ё с ц ы Ш ы ш к і інструктары сабралі 4-га кастрычніка ўсіх сялян і загадалі ім перапісацца з беларусаў на палякоў. Сяляне струсілі і здаліся ўсе— не здалася толькі адна досыць заможная, інтэлігентная шляхоцкая сям'я, каторая не пабаялася і не дапусьціла, каб яе перакідалі з аднае нацыянальнасьці ў другую.

Змаганьне з беларускай школай.

(М. Докшыцы, Дунілаўскаго пав.)

По загаду Лідзкага Школьнага Папячыцеля вучыцель першай беларускай школы ў „Докшыцкім заняпадзе" ў вёсцы Осове—Костусь Шашко — зволен з пасады за тое, што ня мае польскай адукацыі і што адмовіўся ехаць ў Кракаў.

Хаця ён мае ўпісную кніжку, што быў на вучыцельскіх курсах у Вільні й польскую мову ўмее „здавальняюча", але школьная ўлада такіх кніжак за дакумэнт ня прызнае, кажучы, што яны толькі ў „Сярэдняй Літве" маюць моц, а ня ў Рэчы Паспалітай.

На просьбы сялян вёскі Осовы к Школьнай Уладзе, аб назначэньні другога вучыцеля, адказалі, што за „адсутнасьцю" беларускіх вучыцялёў школа ў гэтым школьным годзе будзе зачынена.

Такім чынам, беларуская школа існавала роўна месяц...

25.XII 21 г. Нінок.

ХРОНІКА,

Віншуем нашых праваслаўчытаньнікаў з Калядамі!

Лекцыі беларускае мовы ў Італіі.

Прафэсар В Шэбэдів нрыслаў у нашу рэдакцыю з Гэнуі такое пісьмо:

Паважаны Пане! Зварочуюся да Вас і да ўсяго беларускага грамадзянства з просьбаю не адмовіць прыслаць мне матырыял па беларускай літэратуры — асабліва творы сучаных пісьменьнікаў. Я маю пачаць у першых днях студня лекцыі украінскай і беларускай літэратуры ў Istituto Superiore di Studi Kommerciali. Гэтым Вы зрабілі-б мне вялікую прыемнасьць і далі-б мне магчымасьць лепей асьвятляць беларускую літэратуру —зусім незнаёмую італійскай маладзёжы

З шчырым паважаньнем праф.

В. Шэбэдів.

20 сьнежня 1921 г.

Прывітаньне.

Ад імя віленскіх студэнтаў беларусаў старшыня Спаўняючага Камітэту С. Малафееў прыслаў Зьезду Сельска-Гаспадарскіх работнікаў Сярэдняе Літвы гарачае прывітаньне.

Прывет з Чэхіі.

Міхась Міцька заехаў ужо ў Чэхію і паступіў у школу (Česko Slovensko, Roudanice n. L. Stredni hospodarska škola). Прынялі яго браты — чэхі, як беларуса, асабліва цёпла і памаглі ўстроіцца. М. Міцька просіць перадаць яго прывет гр. гр. Тарашкевічу, Краскоўскаму, Грыневічу і ўсім землякам і сябрам яго.

Ф. Чарнышэвіч, М Запольскі.

Паэт-нашанівец Ф. Чарнышэвіч падаў надоячы голас з Несьвіжа, дзе ён быў дагэтуль і ці пісаў што—невядома.

Паэт Міхалка Запольскі гэтымі днямі прыслаў нам пісьмо і вершы з Юга-Славіі (г. Мітравіца-Срэмская, Планінская вул. 45). Аб сваім жыцьці піша каротка: „Цяжка тутака сядзець".

Булак-Балаховіч галасуе за Польшчу.

5-га гэт. мес. праездам у Брацлаўшчыну быў у Вільні ў „Шляхоцкім" гатэлі Булак-Балаховіч з сваім братам. Яны паехалі на выбары—галасаваць у Віленскі Сойм, наўпрэкі пастанове беларускіх арганізацый.

Выбарныя выдаткі.

Па прапазыцыі Галоўнага Камісара па выбарах асыгнована 20 мільёнаў марак на выбарныя расходы.

Адстаўка Дырэктара.

Газэты паведамляюць аб адстаўцы Дырэктара Дэпартамэнту Унутр. справаў п. Сянкевіча. Кандыдатам на яго месца называюць п. Маліноўскага—старасту места Сэйны, б. Сувальск. губ.

А[рышты] беларусаў.

(Беніц[кая вола]сьць, Ашмян. пав.).

Уночы 7 на 8 сьнежня 1921 г. зьявілася 48 чалавек паліцыі і пасьля рэвізыі ў хатах арыштавалі 14 чалавек. Арыштованы з вёскі Міхневічы: 1) Павел Яцэвіч, 2) Васіль Яцэвіч, 3) Піліп Казлоўскі, 4) Антон Казлоўскі, 5) Іван Казёл, 6) Ягор Рубан; вёскі Амыліны: 7) Мікалай Рамановіч, 8) Русак; в. Ардзеі: 9) Андрэй Вайда: в. Міцькевічы: 10) Царык; в. Вётахава: 11) вучыцялі Іван Дудка і 12) Яўгень Южык; ст. Залесьсе: 13) б. памоцнік начальніка станцыі Ярашэвіч; в. Заськевічы: 14) вучыцель Гаўрылік.

Арыштованых вінавацілі ў нейкім беларускім згаворы. Задаваліся пытаньні аб тым, хто арганізацыяй кіруе і агітуе проці палякоў? Усе арыштованыя пераведзены ў Вільню на Лукішкі і дасюль ня выпушчаны на волю. Звольнены толькі гэтымі днямі Павел Яцэвіч з в. Міхневічы пад залог ў 25.000 марак.

„Беларускі Звон".

У пятніцу 6 студня выйшаў чародны нумар „Беларускага Звону".

Скасаваньне беларускага аддзелу пры дэпартамэнце асьветы.

Беларускі аддзел пры дэпартамэнце асьветы зачынены ад 1-га студня 1922 г.

Рэфэрэнт аддзелу гр. Б. Тарашкевіч лічыцца звольненым, і беларускія школы пераходзяць у веданьне інспэктара польскіх школ п. Ліхтаровіча.

Вечарына земляробаў.

7-га студня ў памяшканьні Цэнтр. Бюро праф. саюзу земляробаў ладзіцца вечарына на беларускай мове; збор з яе пойдзе на карысьць бедных членаў саюза.

Справа Курбскага.

25.XII. Горадня. Справа вядомага беларускага працаўніка гр. У. Курбскаго, будзе слухацца у Акружным Судзе у палове студня месяца.

Абвінавачаваюць яго па 132 арт. карн.

Камітэт помачы уцекачом.

У Горадні выбран камітэт праваслаўнага прыходу пры Япіскапе дзеля помачы праваслаўным, якія цяпер вароючаюцца на бацькаўшчыну. У камітэт увайшло 25 асоб.

„Церковно-Общественный Вѣстникъ".

Эпархіяльная Рада Пінска-Навагрaдскай Эпархіі пачала з 1922 году выдаваць у Пінску месячнік пад назовам „Цэрковно-Общественный Вѣстникъ". Часопісь зьмяшчае ў сабе ня толькі царкоўныя пытаньні, але таксама асьвятляе палітычнае, эканамічнае і сацыяльнае жыцьцё Беларусі. Адрэс выдавецтва: Пінск, Дамініканская, 60.

Да усіх прыхільных газэт.

Дзеля карысьці нашай справы просім пасылаць свае выданьні па адрэсу: Weissruthenisches Presseburo Danzig. III Damm. 11.

Саюз Работнікаў Земляробаў ладзіць у суботу 7 студня беларускі вечар-сьпектакль ў памяшканьні на вуліцы Жэлігоўскага № 4. Прадстаўлена будзе: „На папасе" Я. Купалы, „Галодны Дон-Жуан" і дывэртысмэнт. Танцы на залі да 4 г. раніцы. Увесь даход пойдзе на карысьць Саюза.

Беларускі Муз.-Драм. Гуртoк у пятніцу 6 студня ладзіць маскарад у сваім памяшканьні Біскупскай № 12. Вызначаны два прызы: за лепшы касьцюм і за лепшы танец. Уваходны білет дае права на выйграш „мільяноўкі".

Саюз Работнікаў Земляробаў ладзіць у нядзелю 8 студня папулярную лекцыю па зямельнаму пытаньню у м. Рудоміне.

Адкрыта запісь ахвотнікаў іграць у струнным аркестры пры Белар. Муз.-Драм. Гуртку. Запісывацца можна: Біскупская 12—6.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Грамадзянін Рэдактар!

Пазвольце на страніцах Вашае паважанае часопісі падаць да агульнага ведама, што за тэрміналёгію і наагул за мову ў перакладзенай мной Сярэднявечнай Гісторыі Остэрлёфа і Шустэра, на якой напісана маё імя, я на сябе адказу не бяру.

Такія словы, як „судовы сок", „собскі" замест „ўласны", „баяры" замест „шляхта" і другія нялічаныя „навіны" ўведзены без майго ведама і згоды грам. Янкай Станкевічам, рэдагаваўшым кніжку. Яму-ж, а ня мне, належыцца і чэсьць за іх увядзеньне...

З пашанай

Ант. Луцкевіч.

Вільня, 3. I. 1922.

Беларускі Паказальнік.

Беларускі Нацыянальны Камітэт — Вільня, Вострабрамская вул., 9.

Віленская Беларуская Гімназія (8 клясаў) —Вострабрамская вул., 9.

Цэнтральная Школьная Рада — Вільня Віленская вул., 12.

Беларускае Выдавецкае Таварыства — Вільня, Віленская вуліца, д. 33, кв. 1 (ад 4-5 гадзіны).

Віленскі Бел. Музык.—Драматыч. Гурток —Біскупская вул., д. № 12, кв. 6.

Беларуская кнігарня — Вільня, Завальная вул., 7.

Кааператыў «Райніца» — Вільня, Вялікая Пагулянка, 17.

„Беларускі Звон" — Вільня, Біскупская вул., 12.

Беларускае Прэс - Бюро ў Рэвалі — Europa. Estonija. Rewal. Post-Kast 153, Bielaruskaje Press-buro.

Рыскі аддзел Бел. Культ.— Прасьв. т-ва „Бацькаўшчына" — Latwija, Riga, Nikolaja eela 20, dz. 1.

Белар. Аддзел пры Мініст. Прасьветы ў Латвіі — Latwija, Riga, Nikolaja eela, 36-a.

Белар. Культ.- Прасьв. т-ва „Бацькаўшчына" ў Латгаліі — Дзьвінск, Віцебская вул., 16.

Weissruthenisches Pressburo — Danzig, III Damm, 11.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА 1922 г. НА ИЗДАЮЩІЙСЯ ВЪ ПАРИЖѢ ЕЖЕНЕДѢЛЬНЫЙ ЖУРНАЛЪ

„ЕВРЕЙСКАЯ ТРИБУНА"

посвященный интересамъ русскихъ евреевъ

Въ теченіе 1921 г. въ Еврейской Трибунѣ были помѣщены статьи:

Альфреда Берля, М. М. Винавера, Винницера, проф. П. П. Гронскаго, Д. И. Гроссмана. Эрнестъ Гинзбургера, (Женева) Ю. Делевскаго, Діонео (Лондонъ), С. Ивановича, Е. М. Кулишера, М. Ландау-Алданова, И. О. Левина (Берлинъ), пр.-доц. Миркинъ-Гецевича, Л. Неманова, гр. Нессельроде, проф. А Олара, С. В. Познера, С. Полякова, С. Потресова (С Яблоновскаго), Ф. И. Родичева, П. Рысса, С. Свѣтцкова, С. Юшкевича и др.

ПОДПИСНАЯ ПЛАТА НА ОДНО ИЗДАНІЕ (русское или французское)

Во Франціи въ Парижѣ и провинціи	Въ Англ.	Въ С.Ам.	Въ Германіи Литвѣ, Латвіи и Эстоніи
На годъ . . 25 фр.	10 шилл.	2 долл.	200 герм. м.
На 1/2 г. 15 „	5 „	1 „	100 „
На 3. мѣс8 „	3 „	75 сент.	60 „

La Tribune Juive. Redaction Administration.

38, rue Pergolése (16-e).

Газэтнік МУЙВІД

на Вялікай вул. супроць кнігарні Сыркіна прадае

„Беларускія Ведамасьці"

і ўсе віленскія беларускія газэты.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА 1922 г. на ежедневную политическую, общественную и литературную газэту

„ЗА СВОБОДУ!"

ВЫХОДИТ В ВАРШАВѢ

ДЕВИЗ ГЗЕТЫ: „ЗА РОДИНУ и СВОБОДУ!"

В 1921 Г. В ГАЗЕТѢ ПОМѢЩАЛИСЬ СТАТЬИ: Б. В. Савинкова, Д. В. Философова, А. А. Дикгоф-Деренталя, В. В. Уляницкаго, М. Н. Гнилорыбова, В. В. Португалова, Е. С. Шевченко, Л. Станиславскаго, В. М. Корчемнаго, А. М. Бема, А. Г. Мягкова, И. Л. Соколова, П. Варра, В. Бранда, О. Воинова и др.

ПОДПИСНАЯ ПЛАТА: В Польшѣ в мѣсяц 800 марок, за границу 900 марок. Цѣна номера 30 марок. В Болгаріи 1 л. 50 зл., Сербіи пол., лин. Германіи 3 м. 20 пф., Румыніи 1 л. 20 б., Австріи 20 кр., Франціи, Бельгіи, Швейцаріи и Константинополѣ 50 сент.

ЦѢНЫ ОБЪЯВЛЕНІЙ: За одну миллиметровую строку на первой стр. 80 мар., среди текста 150 м., на 4 стр. 50 м. Об'явленія о розыскѣ и ищущим занятія 20 м. за слово

Adres: Warszawa, Nowy Swiat № 22.

Рэдактар і Выдавец М. Гарэцкі

Друкарня „Друк" Субач, 2.